Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

22 ЛІСТАПАДА 2008 г.
СУБОТА
№ 221
(26334)

Кошт 500 рублёў

ВЫДАЕЦЦА 3 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

## Узаемадзеянню Беларусі і Еўрапейскага саюза надаецца сістэмная аснова

Выбудоўваючы канструктыўны і ўсебаковы дыялог з Еўрапейскім саюзам, Беларусь робіць канкрэтныя захады, якія фарміруюць аснову беларуска-еўрапейскіх адносінаў. На гэта накіраваны ўказы № 633 і № 634, якія Прэзідэнт Беларусі падпісаў 20 лістапада.

У адпаведнасці з указам № 633 кіраўнік дзяржавы даў згоду на падпісанне Рамачнага пагаднення паміж Урадам Рэспублікі Беларусь і Камісіяй Еўрапейскіх супольнасцяў, што вызначае статус і ўмовы рэалізацыі тэхнічнага садзейнічання, якое Еўрасаюз будзе аказваць Беларусі ў рамках Еўрапейскага інструмента добрасуседства і партнёрства. Такім чынам, узаемадзеянню Беларусі і Еўрапейскага саюза надаецца сістэмная аснова, якая дае магчымасць эфектыўна рэалізоўваць сумесныя праекты ў сферах, што ўяўляюць узаемную цікавасць, у прыватнасці, па такіх прыярытэтных для абодвух бакоў напрамках, як энергетыка, транспарт, удасканаленне мытнай інфраструктуры, барацьба з незаконнай міграцыяй і міжнароднай злачыннасцю, ахова навакольнага асяроддзя.

Указ № 634 накіраваны на адаптацыю ў нацыянальнае заканадаўства прынцыпаў, закладзеных у Пагадненні паміж Рэспублікай Беларусь і Камісіяй Еўрапейскіх супольнасцяў аб заснаванні, прывілеях і імунітэтах Прадстаўніцтва Камісіі Еўрапейскіх аб'яднанняў у Рэспубліцы Беларусь, падпісаным 7 сакавіка 2008 года, але яшчэ не ўступіўшым у сілу. Тым самым беларускім бокам ствараюцца спрыяльныя ўмовы для дзейнасці гэтага прадстаўніцтва на тэрыторыі рэспублікі. Гэта дасць магчымасць больш эфектыўна весці дыялог па шырокім спектры пытанняў адносінаў Беларусі з ЕС.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт транспарту з 55-годдзем

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў калектыў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта транспарту з 55-годдзем з дня заснавання ВНУ.**

У віншаванні Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што гэта ВНУ па праву з'яўляецца буйнейшым адукацыйным і навуковым цэнтрам транспартнага і будаўнічага комплексу Беларусі. Выпускнікі ўніверсітэта працуюць на прадпрыемствах найважнейшых галін народнай гаспадаркі, у буйных даследчых арганізацыях, органах дзяржаўнага кіравання, добрасумленна і паспяхова выконваючы задачы інавацыйнага развіцця айчыннай навукі і вытворчасці.

«Упэўнены, што і ў далейшым будзе такой жа эфектыўнай дзейнасць вашага калектыву па падрыхтоўцы высокакваліфікаваных кадраў і выхаванні дастойных грамадзян беларускай дзяржавы», — падкрэсліў Прэзідэнт.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## Беларусь зацікаўлена ў канструктыўнай размове з «Сасьетэ Жэнераль»

Беларусь зацікаўлена ў канструктыўнай размове з банкам па пашырэнні гандлёва-эканамічных адносін паміж краінамі. Аб гэтым заявіў прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі на сустрэчы з упаўнаважаным генеральным дырэктарам французскай банкаўскай групы «Сасьетэ Жэнераль» Філіпам Сітэрнам.

«Мы зацікаўлены ў тым, каб у нас была канструктыўная размова па пашырэнні нашых гандлёва-эканамічных адносін», — сказаў Сяргей Сідорскі, звяртаючыся да Філіпа Сітэрна. «У нас ёсць прапановы не на ўзроўні ідэй, а канкрэтныя праектаў з бізнэс-планамі, або інвестыцыйныя, тэрмінамі акупнасці», — дадаў кіраўнік беларускага ўрада.

Сяргей Сідорскі адзначыў, што Беларусь больш актыўна працуе з вядучым банкам Францыі «Сасьетэ Жэнераль» праз «Белрасбанк». Гэта банк у Беларусі, які інтэнсіўна развіваецца і ва ўмовах сусветнага фінансавага крызісу паказвае добрыя вынікі функцыянавання.

Прэм'ер-міністр падкрэсліў, што ў апошнія гады Беларусь значна знізіла абароты гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва з Францыяй па шэрагу суб'ектыўных і аб'ектыўных прычын. «Са свайго боку Беларусь рабіла ўсё, каб нашы адносіны складваліся больш удачна. Я думаю, што сусветны фінансавы крызіс найбольш абвастрыў праблемы, якія ёсць у еўрапейскіх дзяржаў», — лічыць Сяргей Сідорскі. Пры гэтым ён адзначыў, што стабільнасць беларускай эканомікі дасць дадатковы імпульс развіццю беларуска-французскіх адносінаў.

«Аказваецца, што ў Беларусі таксама ёсць чаму павучыцца. Гэта пацвярджае праведзены на гэтым тыдні ў Лондане Беларускі інвестыцыйны форум, удзел у якім прынялі больш як 300 замежных кампаній, банкаўскіх і фінансавых структур», — сказаў ён.

«Сённяшнюю сустрэчу мы разглядаем як магчымасць развіцця нашых адносінаў, перш за ўсё, у фінансавай сферы», — падкрэсліў прэм'ер-міністр.

У сваю чаргу Філіп Сітэрн адзначыў, што прыехаў у Беларусь у якасці не толькі ўпаўнаважанага генеральнага дырэктара французскай банкаўскай групы «Сасьетэ Жэнераль», але і старшыні савета дырэктараў аднаго з вядучых расійскіх банкаў, а таксама адказнага прадстаўніка французскай асацыяцыі прамыслоўцаў і прадпрымальнікаў. «Пры інвеставанні ў Расію, Беларусь, некаторыя нашы партнёры пытаюцца, навошта мы гэта робім, на што мы адказваем: прыязджайце і пагледзіце, тады вы ўсё зразумееце», — сказаў Філіп Сітэрн.

**БЕЛТА.**

## Перанос Свечкі



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Учора жыхары адной з вуліц вёскі Вяляцічы Барысаўскага раёна адзначылі дзень свайго «вулічнага» ахоўніка — архангела Міхаіла. Па вельмі старажытнай традыцыі, насуперак забаронам і перажыўшы нават вайну, абрад «Перанос свечкі» працягваецца і дагэтуль. Раз на год, якраз на Міхайлаў дзень, свечку і абраз архангела з аднаго дома пераносяць у наступны. Учора святыя для месцічаў рэліквіі з хаты найстарэйшай жыхаркі Вольгі Чарняўчык былі перанесены ў сям'ю Валянціны Вайтовіч. Настаяцель мясцовай царквы протаіерэй айцец Фёдар пятнаццаць гадоў бласлаўляе гэтую ўнікальную і рэдкую традыцыю.**

## Будаваць інавацыйную эканоміку

**«Чым больш у нас будзе экспартаарыентаваных вытворчасцяў, чым больш у нас будзе імпартазамяшчэння, тым больш устойлівай будзе беларуская эканоміка. Нават ва ўмовах фінансавага крызісу», — такую думку выказаў прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі ў Гомелі, дзе адкрыў новую лінію па вытворчасці мінералаватных вырабаў на аснове базальтавага валакна.**

Першая такая лінія на прадпрыемстве «Гомельбудматэрыялы» была ўведзена ў 2005 годзе. Асноўная прадукцыя — цеплаізаляцыйныя пліты — карыстаецца вялікім попытам у спажыўцоў будаўнічай галіны як у Беларусі, так і за яе межамі. Менавіта таму было прынята рашэнне аб ўводзе аналагічнай. Яе зманціравалі за 8 месяцаў замест нарматыўных 18. Будаўніцтва новай лініі асабіста курыраваў прэм'ер-міністр. Магутнасць лініі складае 264 тыс. куб.м мінералаватных пліт у год.

Увод у эксплуатацыю новай лініі дазволіць у поўным аб'ёме забяспечыць будаўнічую галіну рэспублікі сучаснымі цеплаізаляцыйнымі матэрыяламі, а таксама пастаўляць частку прадукцыі на экспарт. «Калі такімі тэмпамі мы будзем будаваць нашу інавацыйную эканоміку, любы крызіс нам не страшны. Галоўнае — рабіць новую канкурэнтаздольную прадукцыю на энергазберагальных эфектыўных лініях сусветнага ўзроўню», — адзначыў прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі.

Кіраўнік Урада таксама прыняў удзел ва ўрачыстасцях, прысвечаных 55-годдзю Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта транспарту, які сам закончыў у 1976 годзе. Што датычыцца перспектыў развіцця сістэмы вышэйшай адукацыі, Сяргей Сідорскі лічыць, што асаблівую ўвагу трэба надаваць развіццю тэхнічнай базы ВНУ. «Будучы інжынер павінен умець працаваць на самым сучасным абсталяванні, якое ёсць на беларускіх прадпрыемствах», — падкрэсліў прэм'ер-міністр Беларусі.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## Заснаваны сцягі Вілейскага раёна, Слуцка і Слуцкага раёна

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сваім указам заснаваў сцяг горада Слуцка і Слуцкага раёна, сцяг Вілейскага раёна, а таксама зацвердзіў палажэнні аб гэтых геральдычных сімвалах, іх апісанне і выявы.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

БПС-БАНК

**С 24 ноября 2008 года ОАО «БПС-Банк» предлагает физическим лицам срочный банковский депозит в белорусских рублях**

**«СБЕРЕГАТЕЛЬНЫЙ»**

**на следующих условиях:**

- срок привлечения – 1 год;
- размер процентов – 17 % годовых;
- минимальная сумма первоначального взноса – 5 000 000 белорусских рублей;
- частичное востребование депозита – до суммы неснижаемого остатка 5 000 000 белорусских рублей;
- возможность внесения дополнительных взносов без ограничения периодичности внесения и суммы;
- ежемесячная капитализация процентов с возможностью их востребования;
- открытие депозита на имя другого лица.

*В связи с принятием решения о прекращении приема средств в срочный банковский депозит в белорусских рублях «Практичный» автоматическое переоформление будет осуществляться по депозитам, срок возврата которых приходится на период в течение с 24.11.2008 по 23.02.2009. По депозитам со сроками возврата, приходящимися на период с 24.02.2009 автоматическое переоформление не осуществляется.*

**Дополнительную информацию можно получить в любом учреждении ОАО «БПС-Банк», на веб-сайте (www.bpsb.by) или по телефону — 148 (многоканальный).**

**Возврат средств физических лиц в ОАО «БПС-Банк» гарантируется в соответствии с законодательством Республики Беларусь.**

*Лицензия Национального банка Республики Беларусь № 4 от 13.11.2008 года на осуществление банковской деятельности. УНП 100219673. ОАО «БПС-Банк»*

## РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

### АЎТАМАБІЛЬ, КАБ ВЫРВАЦЦА НА ВОЛЮ

**запатрабаваў арыштаваны, які захапіў у якасці закладніцы ў папраўчай калоніі № 1 у Мінску медсястру і прыкрываўся жанчынай як жывым шчытом.**

Нягледзячы на свой малады ўзрост, 18-гадовы злачынец, ураджэнец Кіраўскага раёна, ужо быў судзімы за крадзяжы. На гэты раз, удакладнілі карэспандэнту «Звязды» ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС, ён быў арыштаваны па крымінальнай справе аб забойстве. А тыдзень таму зняволенага даставілі ў беларускую сталіцу і змясцілі ў Рэспубліканскую бальніцу папраўчай калоніі з дыягназам «рыніт». Аднак у чацвер у крымінальніка, падобна, канчаткова «знесла дах» (арыштаваны і да гэтага не вызначаўся памяркоўнасцю і вёў сябе нахабна). Напачатку шостай вечара ў пакоі медсястры хірургічнага аддзялення ён раптоўна прыставіў лязо нажа да горла медсястры. Напалоханая жанчына паспрабавала вырвацца, ды толькі дзе там: злачынца парэзаў ёй рукі.

Супрацоўнік аховы, які ўступіў у перамовы са зламыснікам, прапанаваў замест медсястры сябе ў закладнікі. Злачынца пагадзіўся, але і тут справа не абышлася без крыві: каб завалодаць наручнікамі, крымінальнік нанёс афіцэру некалькі нажавых раненняў у вобласць шыі, а пасля скаваў яго рукі.

На месца здарэння тэрмінова прыбыў міністр унутраных спраў Уладзімір Навумаў, які разам з камандзірам спецпадраздзялення па барацьбе з тэрарызмам «Алмаз» Мікалаем Карпянковым праводзілі перамовы са зняволеным. Аднак калі праваахоўнікі ўпэўніліся, што злачынца неадэкватны, а жыццё супрацоўніка органаў унутраных спраў знаходзіцца пад пагрозай, было прынята рашэнне аб ліквідацыі зламысніка. Што датычыцца медсястры і афіцэра, якія пацярпелі ў выніку інцыдэнту, то цяпер іх здароўю ўжо нічога не пагражае. Кіраўніцтва МУС накіравала хадатайніцтва аб прадастаўленні афіцэра-закладніка да дзяржаўнай узнагароды.

**Ігар ГРЫШЫН.**

### У ВЫХАДНЫЯ — МОЦНЫЯ СНЕГАПАДЫ,

### а на наступным тыдні ўначы маразы да мінус 15

**У гэтыя выхадныя чакаецца рэзкае пагаршэнне надвор'я, паведаміў рэдакцыі начальнік службы гідраметэапрагнозаў Рэспубліканскага гідраметцэнтра Дзмітрый РАБАЎ.**

На тэрыторыю Беларусі завітае актыўны паўднёвы цыклон, які імкліва рухаецца з Балкан у бок Санкт-Пецярбурга. Менавіта таму сёння ўдзень, а 23 лістапада на працягу сутак будзе ісці моцны снег, месцамі моцная мяцеліца, на дарогах галалёдзіца і снежныя заносы, наліпанне мокрага снегу на дрэвах і лініях электраперадач, па паўднёвым усходзе галалёд. У нядзелю на большай частцы тэрыторыі Беларусі чакаецца істотнае ўзмацненне ветру парывамі да 15—22 м/с. Гэта сапраўды не жартачкі. Тэмпература паветра ў суботу ўдзень мінус 3 плюс 3 градусы, у нядзелю на працягу сутак — 0—5 марозу.

У панядзелак з невялікімі перапынкамі зноў будзе ісці снег, месцамі мяцеліца, уначы ў асобных раёнах і ўдзень па паўночным усходзе ўзмацненне ветру да 15—20 м/с. Тэмпература паветра ўначы 3—8 марозу, удзень — 0—мінус 6 градусаў. У аўторак паўсюдна чакаецца кароткачасовы снег. Тэмпература паветра ўначы мінус 3—8, удзень — 1—6 марозу.

Пачынаючы з серады стыхія крыху супакоіцца і кароткачасовы снег чакаецца толькі месцамі, але адбудзецца далейшае паніжэнне тэмпературы. Уначы арктычнае паветра пачне «прыпякаць» да 4—10, а пры праясненні — да 13—15 марозу, удзень — 0 — мінус 6 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**



Фота БЕЛТА.

*КУП «Минский областной центр учета недвижимости»*

**ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

по продаже изолированного помещения общ. пл. 379,8 кв.м (цокольный, 1, 2 и 3 этажи), расположенного в административном здании по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11/7. Начальная цена снижена на 20 % и составляет – 1 706 400 000 бел. руб. с НДС. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 17.10.2008 г. Аукцион состоится **09.12.2008 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **08.12.2008 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

**Контактный телефон (8017) 2246134.**
**Сайт в интернете: www.rlt.by**

*КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015.*

БЕЛАРУСБАНК

Открытое акционерное общество «Сберегательный банк «Беларусбанк»

БАНК № 1

№1 ВЫБОР ГОДА 2007

**«ПРЕСТИЖ»**

новый срочный вклад в белорусских рублях и иностранной валюте

Срок действия вклада — 3 месяца.

Размер дохода по вкладу:
- в белорусских рублях — 15 % годовых;
- в российских рублях — 13 % годовых;
- в долларах США, ЕВРО — 11,5 % годовых.

С ПРАВОМ ПОПОЛНЕНИЯ ВКЛАДА.
ФИКСИРОВАННАЯ СТАВКА.
ЕЖЕМЕСЯЧНАЯ КАПИТАЛИЗАЦИЯ ДОХОДА
и возможность его выплаты.
Вклад может быть открыт на имя другого лица.
Подробные условия вклада – на сайте
www.belarusbank.by
и по "зеленому номеру" 8 801 100 5454 (звонок бесплатный)

Наш "ПРЕСТИЖ" — Ваш ДОХОД!

Проценты, выплаченные по вкладам, депозитам в течение 2007 г., млн. белорусских рублей

УНП 100325912. Лицензия на осуществление банковской деятельности НБ РБ N 1 от 28.08.2008 г.
Сохранность и возврат вкладов в ОАО "АСБ Беларусбанк" гарантируются в порядке, установленном законодательством РБ.

## МЕСЦА СУСТРЭЧЫ МЯНЯЦЬ НЕ ТРЭБА!

Да чытача

**Сярод мінчан, сярод тых, хто хоць нейкі час ды жыў у сталіцы, няшмат, відаць, знойдзецца людзей, якія не прызначалі б спатканняў ля галоўпаштамта, якія не прыходзілі б сюды, каб адправіць ліст ці пасылку, атрымаць перавод, купіць найпрыгажэйшыя паштоўкі, заплаціць за паслугі...**

Цяпер сюды вабіць яшчэ адна магчымасць — на пачатку падпісной кампаніі сустрэцца з прадстаўнікамі розных рэспубліканскіх выданняў (у каталогу іх восем з паловай тысяч) пазнаёміцца, «прыцаніцца» і, зразумела ж, падпісацца.




Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

**Адкрывае свята начальнік вытворчасці «Мінская пошта» Жанна Васільеўна ШАБЕКА.**



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

**Павіншаваць з выйгрышам Таццяну Алегаўну БАРЫСЕНКУ падышоў вядучы свята, зорка беларускай эстрады Яўген КРЫЖАНОЎСКІ.**

— Мінчанам для гэтага не абавязкова цяпер ісці ў аддзяленне сувязі, — патлумачыла начальнік вытворчасці «Мінская пошта» Жанна Васільеўна Шабека. — Паштальёна можна запрасіць дадому. Альбо, не выходзячы з яго, афарміць падпіску праз інтэрнэт ці плацёжна-касавыя тэрміналы. Іх у Мінску ўжо больш за 70... Іншымі словамі, мы ва ўсім стараемся ісці насустрач нашым кліентам, насустрач падпісчыкам.

(Заканчэнне на 3-й стар.)

*ОАО «Горизонт» (продавец) совместно с УП «Минский городской центр недвижимости» (организатор аукциона)*

**ПРОВОДЯТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

по продаже здания специализированного для производства электротехнического, электронного и оптического оборудования (инв. номер 500/С-1257), расположенного по адресу: г. Минск, ул. Красная, д. 7, общей площадью 7 175,7 кв. м.

Начальная цена – 29 750 000 000 белорусских рублей без учета НДС.

Площадь земельного участка – 0,4957 га.

Продаваемое здание обременено договорами аренды.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, условиями проведения аукциона; нотариально заверенные копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенные банком копии платежных поручений, подтверждающих внесение задатка и платы за участие в аукционе; а также иные документы в соответствии с условиями проведения аукциона.

Задаток в размере 1 000 000 000 белорусских рублей и плата за участие в аукционе в размере 4 базовых величин (140 000 белорусских рублей) перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, бульвар им. В. Мулявина, 6, код 153001331; УНП 190398583.

Порядок проведения торгов указан в условиях проведения аукциона. Шаг аукциона составляет 1 (один) процент от предыдущей цены объекта продажи, названной аукционистом по ходу аукционных торгов. Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый объект.

Оплата организатору аукциона за его подготовку и проведение производится победителем аукциона помимо оплаты за объект в размере 0,5 процента от цены продажи объекта в срок, указанный в протоколе о результатах аукциона.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем аукциона подписывается в течение 5 календарных дней с даты проведения аукциона. Оплата по договору купли-продажи осуществляется в срок до 01.01.2009. Аукцион состоится **23 декабря 2008 года** в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Заявление на участие в аукционе и необходимые документы принимаются по **20 декабря 2008 года** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок: (017) 227 48 36 – УП «Минский городской центр недвижимости», (017) 334 25 11 – ОАО «Горизонт».**

УНП 190398583.

ISSN 1990 - 763X

*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 22.11.2008 г. (для б/н разлікаў)*

| | |
|---|---|
| 1 долар ЗША | 2 148,00 |
| 1 еўра | 2 694,56 |
| 1 латвійскі лат | 3 799,75 |
| 1 літоўскі літ | 780,49 |
| 1 чэшская крона | 105,27 |
| 1 польскі злоты | 709,51 |
| 1 расійскі рубель | 77,92 |
| 1 украінская грыўня | 333,02 |

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў*

**Цэнтрабанк РФ**

| | |
|---|---|
| USD | 27,5665 |
| 10 UAH | 34,5215 |
| 1000 BYR | 12,8695 |
| EUR | 44,1064 |

*Курс у гандлёвых кампаніях (на 21.11.2008 г.)*

| | |
|---|---|
| USD | 2135 / 2210 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

*Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.*

*ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009*

# Месца сустрэчы мяняць не трэба!

(Пачатак на 1-й стар.)

Ля стэнда нашай газеты іх было няшмат, але ўвагу яны прыцягвалі. Ды яшчэ і якую, бо, згадзіцеся, не на кожным жа сталічным скрыжаванні пачуеш... «сумесь» беларускай і нямецкай. Так-так — чаканай госцяй «Звязды» стала кандыдат педагагічных навук Валянціна Адамаўна Выхота, наша шматгадовая падпісчыца, якая дасканала ведае абедзве гэтыя мовы. Прычым ведае настолькі, што пераклала на нямецкую частку «Новай зямлі». Мелі гонар пагаварыць, паслухаць...

І, зразумела ж, павітаць яшчэ адну падпісчыцу — Таццяну Алегаўну Барысенку, якая па выніках мінулай падпіснай кампаніі выйграла наш каляровы «Віцязь». Забіраць яго яна прыехала з сынам Сцяпанам, яшчэ адзін — Ілья — чакаў іх дома.

— «Звязду» мне параіў выпісаць бацька, — расказвала Таццяна. — Ён жа ўгаварыў запоўніць гэты купон. Я не верыла, што магу нешта выйграць. Ды і газету мы выпісваем зусім не для гэтага — чытаем, падабаецца, што ў ёй вельмі шмат патрэбнага. І для ўсёй сям'і. Нешта — чытаюць нашы бацькі (мы разам жывём), нешта — мы з мужам.

Што ж датычыцца тэлевізара, то да ўчарашняга дня ён у кватэры Барысенкаў быў толькі адзін. Другі купляць пакуль не збіраліся, хоць, безумоўна, у сям'і (дзе, так бы мовіць, тры пакаленні гледачоў) патрэба ў гэтым была — розныя ва ўсіх пажаданні... Затое цяпер...

— Добра будзе! Мы рады, што выпісваем гэту газету, рады, што выйгралі.

Рады былі і мы, што пазнаёміліся з прыгожымі людзьмі. Аднак тэлевізар Таццяне аддалі з умоваю, што яна, выпісаўшы газету з лёгкай рукі свайго бацькі, абавязкова параіць яе сваім сынам. Маленькі Сцяпан на гэта згадзіўся. Цяпер... Хто ведае, мо, не адмовіцца і потым, калі падрасце?

**Валянціна ДОЎНАР.**




**«Звязду», ну безумоўна ж, чытаць прыемней, чым іншыя газеты, — сцвярджае Валянціна Адамаўна ВЫХОТА, — бо яна — родная».**

«Лістапад-2008»

# Каб не нямела душа і не сляплі вочы

**Сёння ўвечары раскрыецца галоўная інтрыга фестывалю — які фільм прызнае лепшым журы і які застануцца глядзець гледачы ў зале Палаца Рэспублікі яшчэ раз, аддаўшы яму свае галасы.**

Але яшчэ ўчора сталі вядомыя лепшыя фільмы «Лістападзіка». У анімацыйнай праграме сёлета амаль усе прызы аддадзены расіянам. Лепшым анімацыйным фільмам прызналі расійскую карціну «Маленькая Васіліса» Дарыны Шміт. Беларускі праект Ігара Волчака «Аповесць мінулых гадоў» атрымаў дыплом журы «За арыгінальнае рашэнне гістарычнай тэмы і захаванне нацыянальных традыцый». А вось сярод поўнаметражных гульнявых фільмаў журы вылучыла «Клас». Гэты эстонскі фільм — не забаўляльная гісторыя для дзяцей. Гэта спроба паставіць складаныя пытанні, якія ўзнікаюць у жыцці сучасных падлеткаў. Рэжысёр Ільмар Рааг здолеў стварыць фільм, які не толькі для дзяцей, але і пра дзяцей. Дарэчы, сёлета была нават асобная праграма, у рамках якой быў паказаны нават расійскі фільм «Ярык», які на радзіме быў успрыняты неадназначна і з цяжкасцю шукае шлях да гледача. Прадзюсар Канстанцін Серабракоў падзякаваў Мінску якраз за магчымасць пазнаёміць з гэтай працай, якую не вельмі хочуць браць у праграму тэлеканалы: для іх галоўнае — лёгкасць, беспраблемнасць, а тут... А тут драма дзіцяці, якое застаецца без мамы і трапляе ў поле зроку людзей, якія глядзяць на хлопчыка з пункту гледжання гандлю, таму што кожны яго орган мае нейкую цану... На думку рэжысёра, сёння ніхто ў Расіі не хоча прызнаваць, што для дзяцей ёсць шмат небяспечных момантаў у сучасным свеце. І нягледзячы на тое, што гэтае кіно было адзначана ўвагай Святланы Мядзведзевай і спецыяльнай граматай Патрыярха Аляксія ІІ, яму не надта былі рады: ёсць табу на некаторыя тэмы. Затое ад «Лістападзіка» гэты фільм атрымаў спецыяльны дыплом «За смеласць у асвятленні актуальных праблем сучаснага грамадства».

Канстанцін Серабракоў, які ў Беларусі ўпершыню, быў вельмі ўражаны цеплынёй прыёму і нават падумаў пра тое, каб зрабіць нейкі сумесны праект. «Гэта можа быць прапаганда сямейных каштоўнасцяў, што актуальна ў любой краіне, — адзначыў Канстанцін. — Магчыма, ролю ў такім праекце магла б выканаць маладая беларуская актрыса Вераніка Пляшкевіч — прыгожы жаночы твар, які трэба здымаць у кіно».

Журы дакументальнага кіно сёлета беларускую стужку адзначыла толькі дыпломам. Але гэта дасягненне, калі ўлічыць, якая насычаная была праграма. І некаторым гэты «Лістапад» можа запомніцца менавіта дакументальнай праграмай. Тым больш што дакументальнае кіно не паказваюць так шырока, яго не так проста дзесьці паглядзець. «Беларуская кінадакументалістыка моцная, я не памятаю за апошні час ніводнага дакументальнага фестывалю, дзе б не было беларускай карціны, — адзначыў Міхаіл Літвякоў, старшыня журы. — Яно вылучаецца не толькі сваёй інфарматыўнасцю, але яшчэ і спробамі мастацкага афармлення, своеасаблівым аўтарскім поглядам».

Аднак стужка «Янка Купала. Неназванае» ўдзельнічала ў конкурсе дакументальнага кіно ад Расіі. Увогуле праграма, на думку журы, была пярэстай і ў далейшым гэты конкурс атрымаў пажаданне знайсці сваю тэму, свой твар. Вельмі ўжо розныя былі працы.

За рэжысуру сёлета адзначаны эстонскі фільм «Свет Лотмана». Але з усіх прац журы вылучыла сёлета як лепшую расійскую стужку «Спісак Кісялёва». Няма нічога дзіўнага, што ў Беларусі, дзе былі спаленыя вёскі, перамагае дакументальны фільм, які звяртаецца да падзей вайны. «Нам здалося, што гэта самы моцны фільм, таму што гістарычная тэма вельмі складаная, але аўтар з ёй справіўся, — падкрэсліў член журы, латвійскі прадзюсар Бруна Ашукс. — Добра зроблена рэканструкцыя, да таго ж яму ўдалося выбудаваць драматургію і па-чалавечы перадаць тое, што ён сам адчувае».

Кіно і ствараецца дзеля таго, каб варушыць нашы пачуцці. Каб абуджаць лепшыя з іх. Каб не нямела душа і каб не сляплі вочы ад безгустоўных бязглуздых рэчаў. Ці было ў нас такое кіно ў асноўнай конкурснай праграме, павінна патлумачыць журы сёння ўвечары на цырымоніі закрыцця фестывалю.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

Добрае сэрца

# «Далонькі» на шчасце. ДЗІЦЯЧАЕ І БУДУЧАЕ

**Белыя мімы — клоўны, фатографы і відэааператары, дыджэі, папулярныя тэлевядучыя, спартсмены, журналісты і «зоркі» эстрады за касамі, паветраныя шарыкі і вялізнае шаравое «бабл-шоу»... 20 лістапада ўсе 5 сталічных рэстаранаў «МакДональдс» ператварыліся ў своеасаблівыя забаўляльныя пляцоўкі. Такім чынам у Беларусі ўжо ў сёмы раз праходзіла дабрачынная акцыя «Сусветны дзень дзіцяці ў МакДональдс».**




Увогуле 20 лістапада па ініцыятыве ААН адзначаецца Сусветны дзень дзіцяці. Свой унёсак у яго робіць і кампанія «МакДональдс», якая праводзіць дабрачынную акцыю не толькі ў Беларусі, але і яшчэ ў больш як 100 краінах свету, дзе толькі ёсць рэстараны гэтай сеткі. Штогод сабраныя ў лістападзе падчас акцыі сродкі накіроўваюцца на набыццё абсталявання для дзіцячых дамоў, клінік, рэабілітацыйных цэнтраў, школ-інтэрнатаў і радзільных дамоў.

У Беларусі за шэсць гадоў правядзення акцыі было сабрана каля 130 мільёнаў рублёў, якія былі выкарыстаны на патрэбы Мінскай школы-інтэрната № 5, дзіцячага сацыяльнага прытулку, неўралагічнага аддзялення 3-й дзіцячай клінічнай бальніцы Мінска, Дзіцячага кардыяхірургічнага цэнтра РНПЦ «Кардыялогія», Мінскага гарадскога цэнтра медыцынскай рэабілітацыі дзяцей з псіханеўралагічнымі захворваннямі. Сёлета акцыя, якая стартавала 1 лістапада, накіраваная на дапамогу ўстановам «Дом дзіцяці № 1» для дзяцей з абмежаваным паражэннем цэнтральнай нервовай сістэмы і псіхікі і «Дом дзіцяці № 2». На раніцу 20 лістапада ад продажу бульбы фры і сімвалічных бірулек-далонек «Я дапамог дзецям!» было атрымана ўжо 45 мільёнаў беларускіх рублёў. Сума немалая. Але і пералік абсталявання, неабходнага абодвум дамам дзіцяці, вялікі: дзіцячыя ложкі, хадункі, прагулачныя каляскі, манежы, камод для цацак, спартыўны комплекс, камп'ютар для ўстаноўкі лагапедычных праграм, кампрэсарны інгалятар, электрамагніт, абсталяванне для жылых і гульнявых пакояў, фізіятэрапеўтычнага кабінета, кабінета лагапеда... Ці хопіць на ўсё гэта выручаных сродкаў? «Мы набудзем усё, што ёсць у спісах, — запэўніла дырэктар ЗП «Макдональдс Беларусь» Вікторыя Данько. — Заяўкі гэтыя рабіліся з улікам збораў мінулых гадоў, у іх пералічана толькі самае неабходнае. Але мы спадзяёмся з дапамогай усіх удзельнікаў акцыі пабіць леташні рэкорд у 49 мільёнаў рублёў, сабраць больш сродкаў, а значыць, набыць больш тэхнікі і абсталявання. І шчыра спадзяёмся, што гэта абсталяванне зробіць жыццё дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, хоць крыху больш камфортным, радасным і светлым».

Прыхільнікаў акцыі, дарэчы, год ад году робіцца ўсё больш. Многія артысты, тэле- і радыёвядучыя ўжо не чакаюць спецыяльнага запрашэння, а самі тэлефануюць з жаданнем устаць за прылавак. Таму 20 лістапада вялізныя чэргі ў рэстаранах стаяць не толькі за хуткім харчаваннем, але яшчэ за аўтографамі — калі яшчэ сустрэнеш у адным месцы алімпійскіх чэмпіёнаў, грабцоў Андрэя і Аляксандра Багдановічаў і кідальніцу молата Аксану Мянькову **(на фота)**, віцэ-прэзідэнта НАК Аляксандра Мядзведзя, акцёра тэатра «Хрыстафор» Яўгена Крыжаноўскага, віджэя Першага музычнага тэлеканала Віталя Воднева і многіх іншых папулярных асобаў? Акрамя таго, гэтага дня з нецярпеннем чакаюць выхаванцы многіх школ-інтэрнатаў і дзіцячых дамоў, для якіх па традыцыі ладзяцца дабрачынныя абеды.

«Я лічу, што на такую акцыю здольныя толькі сталыя людзі і сталае грамадства, у якім людзі могуць і хочуць падзяліцца, дапамагчы іншым», — адзначыла галоўны ўрач сталічнага Дома дзіцяці № 1 Тамара Мурашова. А віцэ-прэзідэнт НАК, трохразовы чэмпіён Алімпійскіх гульняў і сяміразовы чэмпіён свету Аляксандр Мядзведзь дадаў, што падтрымка будучага пакалення — вялікая і важная справа для пабудовы моцнай краіны, і гэта справа абавязкова будзе працягвацца надалей. Так, «МакДональдс» стаў першай кампаніяй, якая заключыла дамову аб супрацоўніцтве з Нацыянальным алімпійскім камітэтам, і супрацоўніцтва гэта доўжыцца ўжо больш як 10 гадоў. Толькі сёлета сумесна былі праведзеныя Адзіны Алімпійскі дзень і Міжнародны дзень бегу, а таксама хакейны турнір «Кубак МакДональдс».

**Вікторыя ЗАХАРАВА.**

Увага!

# АДБУКСІРОЎКА ПА НОВЫХ ЦЭНАХ

**Змяніўся кошт паслуг, якія аказвае Дзяржаўная аўтамабільная інспекцыя МУС Рэспублікі Беларусь.**

У прыватнасці, за эвакуацыю пашкоджанага транспартнага сродку (па заяве ўладальніка) на адлегласць да 10 кіламетраў уключна трэба заплаціць 10 тысяч рублёў, да 20 кіламетраў — 20 тысяч рублёў, звыш 20 кіламетраў — 30 тысяч рублёў. Прымусовая адбуксіроўка транспартнага сродку на стаянку, якая ахоўваецца (у выпадку, які прадугледжаны нарматыўнымі прававымі актамі) абыдзецца ў 12 тысяч рублёў (з поўнай пагрузкай на эвакуатар), ці ў 11 тысяч рублёў (з частковай пагрузкай на эвакуатар).

Адна гадзіна карыстання аўтадромам ДАІ МУС Беларусі для навучэння ваджэнню (на аўтамабілі ўладальніка) каштуе 5500 рублёў, а адна копія ўлікова-рэгістрацыйнага дакумента на транспартны сродак — 2300 рублёў.

Экспертыза, якая ўключае ў сябе зверку нумарнога агрэгата транспартнага сродку з уліковымі данымі і агляд транспартнага сродку па месцы захоўвання ў адпаведнасці са складаннем акта агляду транспартнага сродку для зняцця з уліку, каштуе 9 тысяч рублёў. За ўдзел работнікаў ДАІ МУС Беларусі ў прыёмачных выпрабаваннях транспартных сродкаў трэба будзе заплаціць 24 тысячы рублёў.

Гадзіна лекцый і заняткаў па Правілах дарожнага руху (па заявах юрыдычных і фізічных асобаў) прыроўніваецца да 8500 рублёў. Камп'ютарны паслугі па рэгістрацыі, зняццю з уліку транспартнага сродку ў 1200 рублёў. За суправаджэнне транспартных сродкаў, якія перавозяць буйнагабарытныя, цяжкія і небяспечныя грузы трэба будзе заплаціць 1500 рублёў (за кіламетр).

Экспертыза праграм і навукова-тэхнічных праектаў арганізацый каштуе 24 тысячы рублёў. Грашовы эквівалент захоўвання аўтатранспарту на штрафной стаянцы складае 2500 рублёў за суткі. Калі вы маеце жаданне самастойна падабраць камбінацыю лічбаў і літар свайго рэгістрацыйнага знака, то заплаціце за камплект 2 мільёны рублёў.

За ўзгадненне друкаванай прадукцыі, якая падрыхтавана да выдання, па пытаннях забеспячэння бяспекі дарожнага руху трэба аддаць 8 тысяч рублёў (1 ум. друк. арк.). А выезд супрацоўніка ДАІ для прыёму кваліфікацыйнага экзамену на атрыманне права кіравання механічнымі транспартнымі сродкамі па месцы размяшчэння навучальнай арганізацыі каштуе 8500 рублёў (гадзіна).

**Падрыхтавала Надзея ДРЫЛА.**

### «СКАРБ» ДОМА

Вялікія грошы страціў 56-гадовы мінчанін, які у кватэры трымаў свае сродкі ў валюце і банкаўскіх аблігацыях. Паводле звестак аддзялення інфармацыі і грамадскіх сувязяў ГУУС Мінгарвыканкама, пацярпелы жыве ў адным з дамоў па вуліцы Шафарнянскай. Паводле слоў заяўніка, камусьці ўдалося добра пабагацець, «праінспектаваўшы» яго жыллё: з кватэры знікла 7500 еўра і аблігацыі Белаграпрамбанка на суму 12 мільёнаў рублёў.

**Ігар ГРЫШЫН.**

# ЭЛЕКТРЫЧНЫ ВЕЦЕР

На даху будынка Магілёўскага тэхнапарка з'явіўся вятрак. Гэта першы ў абласным цэнтры ветрагенератар. Праект рэалізаваў інфармацыйна-кансультацыйны цэнтр па энергазберажэнні. Мяркуецца, што вятрак будзе поўнасцю забяспечваць электрычнасцю невялікі офіс цэнтра, дзе пяцьшэсць чалавек працуюць на камп'ютарах, а таксама карыстаюцца бытавой тэхнікай. У вечаровы час устаноўка будзе працаваць на падсветку будынка. Паводле папярэдніх разлікаў, вятрак коштам каля 4 тысяч долараў акупіцца праз 5-7 гадоў.



Фота Ірыны САВОСІНАЙ.

**Ілона ІВАНОВА.**

Спорт-тайм

### БАТЭ І «ВІЦЕБСК» У ЧВЭРЦЬФІНАЛЕ

У чвэрцьфінал розыгрышу Кубка Беларусі па футболе выйшаў барысаўскі БАТЭ і «Віцебск». У матчах у адказ, якія адбыліся 20 лістапада, гэтыя каманды абгулялі адпаведна «Мінск» і жодзінскае «Тарпеда». Самым драматычным аказалася супрацьстаянне чэмпіёна краіны БАТЭ і «Мінска», які на наступны год дэбютуе ў вышэйшай лізе. 11 кастрычніка ў першым матчы 1/8 фіналу БАТЭ, які выступаў у аслабленым складзе, буйна прайграў на сваім полі — 1:4. Асноўны час паўторнай сустрэчы завяршыўся з аналагічным лікам на карысць БАТЭ, пры гэтым барысаўчане забілі чацвёрты мяч у дабаўлены час, а з 84-й хвіліны гулялі ў меншасці пасля выдалення абаронцы Андры Хагуша (мячы: Радзівонаў, 45, Крывец, 73, 75, Блізнюк, 90+3 — Хачатуран, 87). Дадатковы час завяршыўся безвынікова, а ў серыі пенальці мацнейшым быў БАТЭ — 4:3.

У другім матчы «Віцебск» выйграў у Мінску ў фармальнага гаспадара поля жодзінскага «Тарпеда» — 3:1 у дадатковы час. Раней у чвэрцьфінал Кубка Беларусі выйшлі салігорскі «Шахцёр», наваполацкі «Нафтан», гродзенскі «Нёман», мікашэвіцкі «Граніт», мінскі МТЗ-РІПА і «Гомель».

### САСНОЎСКАМУ ЗЛАМАЛІ НОС

У першым тайме кубкавага матча «Мінск» — БАТЭ абаронца гасцей Сяргей Сасноўскі выбыў з гульні на некалькі хвілін, пасля чаго вярнуўся на газон з заклееным пластырам носам. «У Сяргея зламаны нос, але траўма нязначная. Пасля сутыкнення, у якім паўдзельнічаў наш абаронца, мы прынялі ўсе меры, каб удзел у матчы не узмацніў траўму. Са стапрацэнтнай гарантыяй магу сказаць, што ў гульні супраць «Рэала» Сяргей зможа выйсці на поле», — цытуе урача каманды Паўла Булата eSport.by.

### ЦЫПЛАКОЎ ПАКІДАЕ «АВАНГАРД»

Трэнер «Авангарда» 38-гадовы беларускі спецыяліст Уладзімір Цыплакоў пакіне размяшчэнне сібірскага клуба, у якім прапрацаваў усяго 10 дзён. Пасля трох паражэнняў омскага клуба ў чэмпіянаце КХЛ і канфлікту Цыплакова з вядучым форвардам каманды Паўлам Расой кіраўніцтва «Авангарда» прыняло рашэнне адмовіцца ад паслуг спецыяліста.

# В'ЕТНАМСКАЯ ВІСЛАПУЗАЯ ТРАВАЯДНАЯ,

## менавіта гэтая парода свіней выклікае сёння найбольшую цікавасць у нашых гаспадароў

**На Захадзе мініяцюрныя свінкі даўно ўвайшлі ў моду. Іх трымаюць у кватэрах, могуць выйсці на публіку — трымаючы, як сабаку, на павадку. Але ж у нас не для гэтага гадуюць свіней.**



Хіба ў краіне не хапае свіней розных пародаў? Прапануюць: дзюрок, ландрас ці нашы — беларуская пярэстая, беларуская мясная. А тут — куплю, набуду, абмяняю... на замежную з адвіслым жыватом. Чым жа прыцягнула да сябе ўвагу гэтая парода?

Найперш тым, што яна з пароды «хуткаспелых» — ужо на 5-м месяцы дасягае палавой спеласці і можа прывесці ў першы апарос 6-8 парасят, а ў наступныя — 12 і больш. Пры забоі гэтых свіней адходаў у два разы меней, чым у шырокавядомых у нас парод. Каб выгадаваць такую, кармоў давядзецца затраціць у некалькі разоў менш, чым для звычайнай свінні. Вось у гаспадара і ёсць выбар — выгадаваць адну свінню на 150-170 кг ці пяць віслапузых па 50-80 кг і гэта пры аднолькавай затраце кармоў.

Нездарма «в'етнамкі» называюцца траваяднымі. Свежую траву, канюшыну яны асабліва любяць. Безумоўна, не абысціся без караняплодаў: на адной траве сала не нарасціць хутка. Дарэчы, усё скормліваюць у сырым выглядзе.

Свінні невялікія і, магчыма, не кожнаму гаспадару яны будуць па душы — забава, ды і толькі. Наш чалавек прывык свіней мераць крокамі ў даўжыню і пядзямі ў шырыню — у добрага гаспадара яны і вырастаюць часам пад 250 кг, але на гэта патрэбен час. А тут тры апаросы ў год і жывуць віслапузыя да 20 гадоў!

Усе гавораць, што «в'етнамкі» вельмі пакладзістыя ды міралюбівыя — дружаць з усімі жывёламі, а яшчэ ў іх няма звычкі рыць зямлю. Кожны, хто трымаў свіней, ведае, колькі клопату прыносіць гаспадарам свінячы лыч. Іншым разам і зацягнуты ў яго дрот не дапамагае. А тут выпусціў віслапузую на поплаў і яна скубе сабе траўку.

Але за лепшае будзе спытаць пра свіней гэтай пароды тых, хто вырошчвае іх і прадае маладняк.

— Раней у нас былі звычайныя свінні, а апошнім часам перайшлі на «в'етнамак», сёння ўжо іх 21 галава. Яны, найперш, падкупляюць тым, што з імі мала клопату. Не трэба, як раней было, каля іх тупаць. Кінуў сіласу ці нейкіх буракоў ды пайшоў на працу. А з вясны свінні гуляюць па маладым садзе і ніводнага дрэўца не падрыюць. А яшчэ свінні гэтай пароды меней хварэюць, хоць маладняк і тыя, што ідуць на забой, усю зіму на вуліцы, пад паветкай. «Скажу, што вырошчваць віслапузых, — выгадна», — расказала Ева Глінская з Кобрына.

І Ніна Юрлова з Брэста не можа нарадавацца на сваіх гадаванцаў і кажа, што нездарма «в'етнамак» называюць вялікімі віслапузымі трусамі — грызуць апад яблыкаў, сліў... і мяса ў іх вельмі смачнае — беконнае. Але ёсць адна праблема — да сваіх гадаванцаў яна так прывыкае, што няпроста з імі развітацца. Дзіўная жывёліна — ласкавая і разумная.

Усё добра, але некаторыя спецыялісты заяўляюць, што пры развядзенні в'етнамскіх віслапузых ёсць адзін неадпрацаваны ў нас момант. Развядзенне гэтай пароды не пастаўлена на навуковую аснову і негатыўны бок яшчэ сябе пакажа. Мода на «в'етнамак» успыхнула спантанна. Завёў адзін, другі... і ўжо захацелася многім набыць гэтых свіней, бо ёсць пэўная выгада.

Думаю, што нашы людзі прагматычныя, і калі б не было прыбытку, то мода хутка прайшла б. Цяжка ўявіць, што на вуліцы нехта будзе шпацыраваць са свіннёю на павадку. Свінні ў нас не для забавы.

А вось роднаснае скрыжаванне тут можа быць, бо віслапузых у нас не так і многа. Калі свінак узяць з аднаго гнязда, то кныра неабходна браць з другога. Родналасныя лініі не павінны перасякацца. Племяннной работай ніхто не займаецца, і ў гэтым мінус.

А якая цана на парасят? Просяць за адно сто долараў, а за парачку — 500 тысяч рублёў. У кожнага гаспадара свой кошт, але разбежка невялікая.

На маёй дачы на пяці сотках — трава па пояс і падлесак падрастае. Думаў абгарадзіцца і пару дзічкоў запусціць, але, навёўшы даведкі пра «в'етнамак», вырашыў, што віслапузыя лепш падыдуць. Зямлю рыць не будуць і следам, як сабакі... а вось што з імі будзе рабіць, калі расплодзяцца, — не ведаю. Але гэта заўтрашні дзень...

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**


## ФОНД «МИНСКОБЛГОСИМУЩЕСТВО»

**«24» декабря 2008 года в 14.30 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5 проводит аукцион**

**по продаже объекта, находящегося в республиканской собственности, и права заключения договора аренды земельного участка, необходимого для его обслуживания, которые составляют единый предмет аукциона**:

**На аукционные торги выставляется:**

| Наименование недвижимого имущества | Характеристика недвижимого имущества | Информация о земельном участке для обслуживания продаваемого недвижимого имущества | Начальная цена единого предмета аукциона, рублей в т.ч. (недвижимое имущество/ право заключения договора аренды земельного участка) | Сумма задатка для участия в аукционе, рублей | Продавец недвижимого имущества |
|---|---|---|---|---|---|
| Капитальное строение (здание склада) (инв. № 612/С-4317), расположенное по ул. Дорожной, 1 в г. Жодино Минской области | Здание одноэтажное с пристройкой, фундамент бетонный, стены кирпичные, крыша шиферная, полы бетонные, инженерные коммуникации отсутствуют. Год постройки 1959. Общая площадь182,0 кв.м | Площадь 0,20 га. Срок аренды земельного участка 50 лет. Арендодатель: Жодинский горисполком. Решением Жодинского горисполкома от 10 ноября 2008 г. № 1702 земельный участок изъят для обслуживания склада | 11 597 089 (1 530 929 / 10 066 160) | 1 000 000 | Производственное республиканское унитарное предприятие «Зеленоборское». Минская область, Смолевичский район, п. Зеленый Бор, тел. (8 01775) 25671, 25 650 |

**К участию в аукционных торгах допускаются:** юридические лица, индивидуальные предприниматели, граждане Республики Беларусь и иностранные граждане, представившие в фонд «Минскоблгосимущество» в сроки, указанные в извещении, заявление на участие в аукционе по форме, со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), нотариально удостоверенные копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации, также представитель должен иметь при себе паспорт или иной документ, удостоверяющий личность;

индивидуальным предпринимателем – нотариально удостоверенная копия свидетельства о государственной регистрации, представителем индивидуального предпринимателя дополнительно представляется нотариально удостоверенная доверенность;

***☎ — Святлана Андрэеўна, званю з Асіповічаў. Нашай унучцы ўжо год і сем месяцаў, але дзяўчынка не гаворыць ні слова. Мы з дзедам турбуемся. Аднак бацькі малой заспакоены, кажуць, што быццам, да трох гадоў дзіця «мае права» маўчаць. Ці так гэта? Ці не час звярнуцца да нейкага спецыяліста, каб потым не было позна?***

— Магчыма, дзед з бабуляй турбуюцца не дарэмна. І хоць год і сем месяцаў — гэта не такі вялікі ўзрост, каб дзіця не гаварыла, усё ж нейкія асобныя словы яно павінна вымаўляць. Да гэтага ўзросту павінны ўжо з'явіцца асобныя элементы маўлення.

Звярнуцца трэба да лагапеда, а таксама да дзіцячага псіхіятра, каб пагледзець, ці няма нейкіх дэфектаў развіцця. Калі лагапед не знойдзе арганічнай паталогіі і будзе стымуляваць развіццё маўлення, з цягам часу сітуацыя выправіцца. Ёсць такія дзеці, якія маўчаць да 3—4 гадоў, а потым адразу пачынаюць гаварыць сказамі. Але для таго каб падстрахавацца і не ўпусціць чагосьці важнага, лепш паказацца спецыялісту.

***☎ — Мінск на провадзе, завуць мяне Надзея. Бацькі маёй пляменніцы гавораць, што дзяўчынка дрэнна харчуецца. Яны літаральна з рэменем прымушаюць яе і снедаць, і абедаць, і вячэраць. Ці маюць яны рацыю?***

— Калі дзяўчынка па росце і вазе мае добрыя паказчыкі, то прымушаць яе есці не трэба. Тым больш з рэменем. Такі прымус прыводзіць лішні раз да стрэсу. Можна паступіць так: зменшыць порцыі ці зрабіць працэс прыёму ежы больш цікавым, напрыклад, на кашы зрабіць вочкі з вішанек. Калі ж з вагой ёсць праблемы, трэба пракансультавацца з гастраэнтэролагам. Магчыма, у дзяўчынкі нейкія праблемы са страваваннем.

**«Прамую лінію» правялі Святлана БАРЫСЕНКА і Вольга ШАЎКО.**

***(Працяг будзе.)***

Наша ежа

# ГМА ў правінцыі: усе ведаюць, ніхто не бачыў

**Міша вучыцца ў 4-м класе і яшчэ не ведае, што такое генная інжынерыя. Але менавіта з-за яе ён ужо завяршыў кар'еру вялікага знаўцы—выпрабавальніка ласункаў усемагчымых відаў і краін-вытворцаў. Аднойчы на хлопчыка зрабіла ўражанне вітрына, дзе на таварах чырвоным колерам было пазначана «Утрымлівае ГМА».**

**«Хто гэта такія?» — трывожна пытаўся Мішка. Блытаныя тлумачэнні бацькоў пра таямнічыя генетычна мадыфікаваныя арганізмы пакінулі ў свядомасці малога адну выснову: з вялікага асартыменту салодкіх прадуктаў беларускія вафелькі і шакаладкі, без аніякага сумніву, не маюць ГМА.**

**З гэтага часу Міша падтрымлівае айчынных вытворцаў, з-за чаго выйшла нават некаторая эканомія для сямейнага бюджэту. Вось так малады чалавек атрымаў урок здаровага харчавання.**

### КРАІНЫ І ЛЮДЗІ МАЮЦЬ ПРАВА ВЫБАРУ

Без ведаў пра ГМА ў XXI стагоддзі не пражыць. Спецыялісты ў справе харчавання пераконваюць: каб меней хварэць і болей жыць, трэба разбірацца ў ежы.

Генетычна мадыфікаваны арганізм штучна створаны чалавекам. З дапамогай біятэхналогіі ў расліну ўкаранёны чужыя гены, якія дапамагаюць палепшыць смак, павялічыць тэрміны захоўвання і супраціўляльнасць шкоднікам. Працэс пачаўся з соі і кукурузы, а цяпер ёсць ГМ-бульба, таматы, рыс, буракі, пшаніца і шмат іншага.

Меркаванні навукоўцаў наконт ГМА падзяліліся: адны папярэджваюць пра рызыку іх ужывання — напрыклад, небяспеку развіцця анкалагічных захворванняў, іншыя, наадварот, пераконваюць у абсалютнай бяспецы прадуктаў геннай інжынерыі і бачаць у іх выратаванне для галоднага чалавецтва.

Па-рознаму ставяцца да праблемы і ўрады краін свету. У ЗША і Канадзе трансгены прыроўненыя да звычайных прадуктаў харчавання, а краіны Афрыкі не дазваляюць увоз харчоў з ГМА.

У Беларусі такія прадукты не забароненыя, аднак заканадаўства абавязвае папярэдзіць спажыўца аб утрыманні ГМА. Інфармацыя дае людзям самае галоўнае — права выбару.

### АЙЧЫННЫЯ ВЫТВОРЦЫ НЕ ХОЧУЦЬ ГМА

Ва ўпраўленні гандлю і паслуг Магілёўскага аблвыканкама прад'яўляюць стос нарматыўных дакументаў пра ГМА: законы, пастановы ўрада і міністэрстваў. Як доказ належнага выканання — фотаздымак, зроблены ў адным з бабруйскіх магазінаў: на пакунку расійскіх пельменяў — вялізны надпіс пра ўтрыманне ГМА.

— У гандлёвай сетцы вобласці мала прадуктаў з трансгенамі, — каментуе сітуацыю першы намеснік начальніка ўпраўлення гандлю Алег Шаршнёў. — У асноўным гэта не беларускія харчы, а вытворчасці Расіі і Польшчы. Тыя ж пельмені, замарожаныя піцы і блінчыкі, соевае мяса...

Сам Алег Шаршнёў не лічыць ГМА чымсьці страшным. Ён упэўнены, што кантрольны ланцуг вакол харчоў у Беларусі не дазволіць продаж небяспечных для здароўя прадуктаў, з ГМА альбо без.

— Няма адназначнага адказу: шкодныя харчы з ГМА альбо не. Але ўсё ж пытанне тут ёсць, — прызнаецца галоўны інспектар аддзела арганізацыі гандлю Кацярына Сарокіна. — Гэту тэму цяпер пачынаюць шырока асвятляць, што прымушае мяне задумацца не толькі над кантролем па інфармаванні пакупнікоў, але і над асабістым выбарам.

— На ўсякі выпадак можна ўжываць айчынныя харчы! — раіць тым, хто хоча перастрахавацца, Алег Шаршнёў. — Беларускія прадпрыемствы не вырабляюць прадуктаў з трансгенамі.

— Мы не ўжываем сою з ГМА і не збіраемся, — паведаміла галоўны тэхнолаг ААТ «Магілёўскі мясакамбінат» Аксана Карнеева. — Хоць дабаўкі з ГМА каштуюць у 1,5 раза меней за звычайныя, мы аддаём перавагу натуральным прадуктам.

Выкарыстоўваць дабаўкі з ГМА цалкам магчыма, але інфармацыю пра ўтрыманне трансгенаў трэба змясціць на ўпакоўцы. Сучасныя ўедлівыя пакупнікі ўжо налаўчыліся чытаць напісаныя дробнымі літарамі звесткі пра склад прадукту. Вытворцы асцерагаюцца, што як след не вывучаныя ГМА будуць адпужваць спажыўцоў.

### ПРАЎДЗІВЫЯ ЦЭННІКІ І НАТУРАЛЬНАЯ ГАСПАДАРКА

У гастраномах на цэнтральнай вуліцы Магілёва мне так і не ўдалося ні пабачыць самой ніводнага папярэджання аб утрыманні ГМА, ні сустрэць адвачоцаў. У адным з гандлёвых прадпрыемстваў нават зрабілі ў цэнніках асобную графу для ГМА, аднак у «акенцах» нязменна стаіць адмоўны крыжык.

**«Ужывайце натуральныя беларускія харчы, у якіх няма ГМА», — раяць медыкі, навукоўцы і гандляры.**

Агульнае меркаванне работнікаў гандлю: трэба выконваць закон, і яны гатовыя паведаміць людзям пра трансгены. Праўда, некаторыя працаўніцы прылаўкаў шчыра асцерагаюцца: а ці не знізяць праўдзівыя цэннікі тавараазварот і, адпаведна, прыбыткі і заробкі? Іншыя не маюць добрага меркавання пра свядомасць пакупнікоў: маўляў, набылі — ды з'елі, акрамя як пра запаўненне страўніка шэрая народная маса не клапоціцца. Хоць і гандляркі не ўсе ведаюць, што такое ГМА і з чым гэта «ядуць».

— Трэба, каб муж быў рыбак і прыносіў свежую рыбу, — загадчыца аднаго з магілёўскіх магазінаў Наталля Янчанка выкладае свой план рацыянальнага харчавання. — Не пашкодзіць таксама свая́к-паляўнічы. Вырошчваць на дачы бульбу і гародніну, а ў лесе збіраць грыбы і ягады. Карацей, весці натуральную гаспадарку. Тады вас, як і мяне, не будзе клапаціць ГМА.

У крамах аўтазаправачных станцый «Слаўнафты» ў Магілёве катэгарычна і прынцыпова не хочуць хаваць ад сваіх пакупнікоў любую інфармацыю пра прадукты. Верагодна, таму тут папярэджваюць нават пра магчымасць утрымання ГМА ва ўсіх прадуктах, якія падлягаюць кантролю з гэтай нагоды. Прылаўкі стракацяць ад чырвоных надпісаў.

— Культура і парадак пачынаецца з нас саміх, — тлумачыць сваю пазіцыю дырэктар АЗС № 26 на Мінскай шашы Максім Сіманенка. — Прафесар Праабражэнскі ў «Сабачым сэрцы» казаў, што разруха пачынаецца ў галовах, і гэта слушна. Я дрэнна стаўлюся да ГМА, што ўтрымліваюцца амаль усюды ў соі. Чытаў, што ў мышэй у наступным пакаленні ад трансгеннай ежы пачынаецца бясплоддзе. На сваіх дзецях правяраць гэта не хочацца.



Фота Пятра ФАМІНА.

### ГАЛОДНЫЯ КАЛАРАДСКІЯ ЖУКІ І БЯЗДЗЕТНЫЯ ТАРАКАНЫ

Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт харчавання не ўключае трансгенныя прадукты ў рэцэптуры, якія распрацоўвае.

— Мы робім націск на экалагічна чыстую прадукцыю, якая дакладна бяспечная для чалавека, — падкрэсліў рэктар Вячаслаў Шаршуноў. — І я асабіста, хоць мне і 60 гадоў, за таннымі трансгенамі не гнаўся б. Хоць ведаю, што расійскі акадэмік Эрнст (бацька вядомага тэледзеяча Канстанціна Эрнста), які харчуецца трансгеннай свінінай, сцвярджае, што гэта не мае ўплыву на здароўе.

— Але ўсё ж лепей гэтага не есці, — раіць дырэктар Навукова-даследчага цэнтра Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі Юрый Цібец. — Пачакаем, пакуль навука скажа дакладна — шкодна ГМА альбо не. Звесткі не суцяшаюць. Напрыклад, трансгенную бульбу каларадскі жук не ўспрымае як ежу. А ў вялікіх гарадах, дзе найбольш актыўна выкарыстоўваюцца ГМА, знікаюць, бо не размнажаюцца, тараканы. Так што лепш з гэтым пачакаць. Ёсць жа досыць нармальных харчоў!

Магілёўскія медыкі, з якімі давялося пагутарыць, да ГМА таксама ставяцца насцярожана.

— Таму што праз колькі гадоў навукоўцы могуць аб'явіць, што трансгены — прычына хваробаў, — тлумачыць загадчыца гастраэнтэралагічнага аддзялення Магілёўскай абласной бальніцы Наталля Мядзведнік. — Пакуль не адрынуты сумневы ў бяспецы ГМА, асабіста я аддаю перавагу айчынным прадуктам харчавання. У нас няма інфармацыі, як трансгены ўплываюць на страўнікава-кішачны тракт. Нашы пацыенты яшчэ мала пытаюцца пра ГМА, але людзі са здаровым сэнсам, якія клапоцяцца пра сваё здароўе, павінны задумацца.

### У БЕЛАРУСКІМ САЛЕ ГМА ДАКЛАДНА НЯМА

На інтэрнэт-сайце «Прадукты геннай інжынерыі ў Беларусі» ёсць магчымасць выказаць сваю думку: большасць, амаль 55 працэнтаў, ні пры якіх абставінах не будуць набываць прадукты з ГМА. Але каля чвэрці, 23 працэнты, не бачаць у ГМА ніякай бяспекі і гатовыя «з лёгкім сэрцам» набываць і спажываць прадукты геннай інжынерыі.

Як паказалі «жывыя» апытанні спажыўцоў у Магілёве, ГМА не лічаць актуальнай праблемай толькі самыя маладыя і састарэлыя людзі. Першыя яшчэ не задумваюцца пра здароўе і радасна паглынаюць тоны чыпсаў, якія запіваюць каністрамі салодкай газіроўкі. Моладзь у большасці цэніць насычаны смак і модныя брэнды.

— Гавораць, што ГМА можа быць у маіх любімых ласунках, — разважае малады юрыст Наталля Дзітчанка. — Але я іх усё роўна буду есці, бо яны мне падабаюцца. Будуць яшчэ навіны і адкрыцці ў харчаванні, якія дадуць гарачыя тэмы для абмеркавання. Трэба да гэтага ставіцца спакойна.

Пенсіянеры лічаць, што ім запозна ўжо разбірацца з ГМА. Жыхары глыбінкі гэтым увогуле не цікавяцца. Амаль што ва ўсіх, нават у райцэнтрах, ёсць падсобныя гаспадаркі, палеткі і жывёла. А які ГМА можа ўтрымліваць бульба з уласнага агарода ці падчаровак з асабіста выгадаванай свінні?

Вось і начальнік упраўлення аховы здароўя Магілёўскага аблвыканкама Валерый Малашка жартам і ўсур'ёз раіць есці беларускае сала і не думаць пра генную інжынерыю.

— Ніхто не ведае, чым гэта скончыцца, — прызнаўся ў складаным асабістым стаўленні да ГМА кіраўнік аховы здароўя вобласці. — Гэта не толькі біялагічная, але і эканамічная праблема. Таму што генетычна мадыфікаваныя прадукты — больш танныя. Асабіста я раіў бы ўжываць натуральныя харчы айчыннай вытворчасці.

### НА ТРАНСГЕНЫ ПРАВЕРАЦЬ ЧЫПСЫ І КЕТЧУПЫ

Праўда, летась санітарныя ўрачы выявілі ў бабруйскіх сасісках ГМА. Вінавата было не прадпрыемства, а ізраільскі пастаўшчык соі, які змаўчаў пра трансген. Ненатуральная соя вярнулася на радзіму, але і продаж сасісак быў забаронены. Не таму, што яны былі дрэнныя, а таму, што спажыўцам не паведамілі пра ГМА.

Падобныя даследаванні Магілёўскі абласны цэнтр гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя праводзіць другі год. Летась са 120 пробаў трансген знайшлі толькі ў чатырох, напрыклад — у соевай муцэ расійскай вытворчасці.

— Цяпер мы праводзім вялікую акцыю па праверцы ўтрымання ГМА ў самых розных прадуктах, — паведаміла загадчык аддзялення гігіены харчавання Алена Камінская. — У працы ў лабараторыі адначасова знаходзіцца тры сотні пробаў. Шмат самых розных прадуктаў, айчынных і імпартных: рыс, чыпсы, дзіцячае харчаванне (у Беларусі ўтрыманне ГМА ў ім катэгарычна забароненае), кетчупы, таматы, папкорны, хлебцы, кукурузныя крупы, соевыя соўсы і паўфабрыкаты мясных прадуктаў, якія ўтрымліваюць соевы бялок. Прадуктамі патэнцыйнага ўтрымання трансгенаў з'яўляюцца сучасныя харчы новага накірунку для хуткага харчавання: напрыклад, бульбяное пюрэ і супы хуткага прыгатавання.

Сама Алена Камінская практычна яшчэ не бачыла ў гандлёвай сетцы папярэджанні пра ГМА, але такі надпіс яна ў любым выпадку лічыць толькі інфармацыяй для разважанняў.

— Галоўнае — даць чалавеку права выбару, а потым кожны вырашыць сам, — упэўнена Камінская. — Не трэба тут страхаў і жахаў, а павінен быць разумны, узважаны падыход да харчавання. У нас вялізны выбар харчоў на любы кашалёк. Чым больш здаровым, рацыянальным, чыстым, натуральным будзе ваша харчаванне, тым будзе лепей.

Цяпер распрацаваны спецыяльны знак: «Не ўтрымлівае ГМА». Ён добраахвотны, і ўжо з'явіўся на прадуктах у сталічных крамах. Дацягнецца і да правінцыі.

Праўда, далёка не ўсе згодныя з высновай, што ГМА — гэта актуальная для нас тэма. У ліку пярэчанняў — малая колькасць трансгенных харчоў на беларускім рынку. Аднак сёння, калі ў свеце пануе фінансавы крызіс і ўсе чакаюць яшчэ горшага, не выключана больш шырокае ўжыванне танных ГМА. У ліку безумоўных пацвярджэнняў — выснова, што кожны разумны чалавек павінен ведаць, што ён спажывае.

**Ілона ІВАНОВА.**



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

**У 105 мінскай сярэдняй школе заканчваецца вакцынацыя вучняў пачатковых класаў. Разам са школьнай медыцынскай сястрой Валянцінай Аляксеевай працуюць урач прышчэпкавага кабінета 12-й дзіцячай паліклінікі Таццяна Батурына і медсястра Юлія СТАРАВОЙТАВА (на здымку).**

Сіла слова

# «ЛЯКУ, ЛЯКУ, ПЕРАЛЯКУ...»

Некалі М. Нікіфароўскі пісаў: «У тых цяжкіх выпадках, калі знямоглае дзіця набліжаецца да смерці і калі яно змагаецца з ёю, маці знімае «вярхоўку» ляснога мурашніку, гатуе адвар і купае ў ім дзіця тры дні запар. Пасля апошняга купання маці наведвае парушаны мурашнік. Калі той папраўлены і мае ранейшы выгляд, на папраўку дзіцяці ёсць надзея; калі ж мурашнік застаўся разбураны, дзіця непазбежна хутка памрэ». У тым самым выпадку ўжываюць і другі сродак. На грудзі безнадзейна хвораму дзіцяці льюць «драбінку алею». Калі алей не ўбіраецца ў цела, дзіця «замрэць»; калі ж ён хутка ўбярэцца, пакінуўшы толькі вільготны след, — дзіця ачуняе і доўга пражыве». «Крыксы» — няспынны і беспрычынны крык дзіцяці, які даводзіць яго да таго, што яно «накрычыць пуп» альбо «кілу». Заўважана, што ў «крыксах» дзіця шмат есць і ў той жа час худнее і неўзабаве даходзіць да «сушчоў». Пры першым паяўленні «крыксаў», карыстаючыся адсутнасцю сямейнікаў, маці кладзе спавітае дзіця ў кубел, які знаходзіцца не ў хаце, і замыкае яго. Пасля гэтага яна тройчы выбягае на вуліцу, сплёўвае кожны раз і пазірае, ці не ідзе хто з таго ці другога боку? Калі ўсе тры разы яна нікога не ўбачыла, дзіця хутка паправіцца; калі ж яна хоць на момант убачыла праезджага ці прахожага, «крыксы» неўзабаве пяройдуць у «сушчы», якія звычайна вылечваюцца з цяжкасцю. Калі стала зразумелым, што дзіця ў «сушчах», маці нясе яго пасля заходу сонца да першага за вёскаю крыжа, кладзе ля падножжа і тройчы гаворыць:

*Крыжу мілосціў!*
*Дай цела на косці!*
*А не дасі цела на косці —*
*Прымі да сваёй мілосці!*

Самыя блізкія сваякі не павінны ведаць, куды і навошта хадзіла маці з дзіцем. Сваю адсутнасць яна звычайна прыкрывае неабходнасцю пазычыць што-небудзь у суседзяў; пад гэтай пазыкай маці разумее пазыку ў крыжа цела на косці. Гэтыя дзеянні завяршаюцца выздараўленнем або смерцю. Хворага на «сушчы» трэба выкупаць у вадзе, падсоленай трыма «нюшкамі» чацвярговай солі, а памыі выліць на маладое дрэва, якое бліжэй за іншыя да хаты: «сушчы» пяройдуць на дрэва, і яно ссохне. Калі ж дрэва ўцалее, тады трэба чакаць дзіцячай смерці. Карысна купаць дзіця і ў лузе, куды дабаўлена крыху простай солі. Купаць трэба дванаццаць разоў і ў час купання паіць хворага тою вадою ад купання столькі, колькі ён можа выпіць. У народзе раілі і іншае: «Трэба ўзяць акрайчык жытняга хлеба, завярнуць з соллю ў белую анучку, перавязаць чырвонай ніткай, тады ўзяць дзіцёнку вузельчыкам етым галоўку пагладзіць да пад печку падкінуць».(Жытк. р-н). Пры гэтым абавязкова выконваліся замовы: «Госпаду Богу памалюся, Святой Прачыстай пакланюся. Добры вечар, куркі-курвічкі! Вазьміце ў раба божага начнічкі, начныя і дзянныя. Вы, куркі, крычыце, а наш раб божы няхай маўчыць. Госпаду Богу памалюся, Святой Прачыстай пакланюся». Гаворыцца пад насестам: « Госпаду Богу памалюся, Прачыстай Мацеры пакланюся! Добры дзень, куркі-матрункі! Ці спіце вы? — Спім! Няхай жа і раб божы Змітрок спіць». М. Нікіфароўскі падкрэсліваў: «Начніцы — гэта хвароба, калі спакойнае ўдзень і, відаць, здаровае дзіця не спіць і крычыць уночы да ранішняга досвітку. Першы сродак лячэння гэтай хваробы заключаецца ў тым, што ўсёй абстаноўцы стараюцца надаць зменены выгляд: кладуць дзіця ў калысцы ножкамі ў «галавашкі», надзяваюць на яго вывернутую кашулю рукавамі на ножкі; удзень завешваюць ці закрываюць вокны, а ўначы робяць узмоцненае асвятленне». Знаходзім і такое сведчанне: «У лячэнні начніцаў можна ўжыць і такі сродак. Трэба прынесці вады ў новым гаршку з такога месца, дзе ніхто не чорпаў яе прыблізна тры гады, нагрэць да кіпення, паклаўшы ў гаршчок нож, іголку і верацяно, прыкрыць драўлянай міскай і, паставіўшы гаршчок пад калыску, дзе ляжыць дзіця, асцярожна перавярнуць гаршчок. Калі вада хутка перамесціцца з гаршка ў міску, то дзіця хутка аслабаніцца ад начніцаў».

Пасля заходу сонца маці становіцца з хворым дзіцем ля акна ў хаце, а другая, блізкая ёй, жанчына падыходзіць да таго самага акна і пытае: «А ці ёсць у вас начнэй дзяцёнэк?» — Ёсць, ёсць! — адказвае маці. — Усё ноччу не спіць!» «Няхай валей ён ідзець у тыя начніцы, айдзе дзеўкі й маладзіцы!» Пасля гэтых слоў абедзве жанчыны дзьмухаюць над галавой у дзіцяці так, каб іх «дзьмухі» сутыкаліся.

А. Багдановіч адносна ўсяго гэтага пісаў: «Калі дзеці курчацца і крычаць ад болю, не спяць па начах, — гэта іх мучаюць начніцы — маленькія і злыя духі ночы. Іх можа прагнаць толькі светланосны пачатак — агонь. Уначы, калі дзіця асабліва раскрычыцца, паляць печ і перад полымем «палаюць» хворае дзіця... Яго кладуць у прыпол, качаюць перад полымем з лёгкім устрэсваннем і нашэптваюць замову:

*Цёмная ночка*
*Начніц нарадзіла, —*
*Маломy дзіцяці*
*Мукі нарабіла;*
*Яснае соўнійка*
*Дзень пачынаець,*
*Начніц праганяець,*
*Дзянніц насылаець,*
*Боль сунімаець.*
*Шух у печ! Шух у печ!..*

Полымя ці паглынае начніцы, ці праганяе прэч».

Калі малое паводзіла сябе неяк ненатуральна: усяго баялася, уздрыгвала, крычала ноччу, не магло само адысці ў цёмны кут, то тут вялі гаворку пра тое, што яно злякана, спалохана, «спуджанае». Ад такой напасці магла вылечваць і сама маці, бо кожная з гаспадынь ведала, як абавязковы мінімум, па некалькі замоў «Ад зляку». Калі ж нешта ў жанчыны не атрымлівалася і дзіця па-ранейшаму баялася, «лякалася», дык гаварылі, што ў яго «вельмі моцны спалох» і трэба тэрмінова выклікаць ці несці малое да спрактыкаванай знахаркі, якая «зашэпча яму той страх», бо калі пацягнуць крыху, дык «той страх укараніцца, і ўжо чалавек увесь свой век будзе такі баязлівы ды страшлівы, ад чаго можа і заўчасна памерці».

«Пужышча. Ідзі на лагавішча! Сабачая, цялячая, каціная, кароўя, лашадзіная, курыная, гусіная, жаночая, мужчынская, калючая і палючая. Як гэтаму дрэву на карняку не стаяць, лістамі не трыпаць, так у гэтага раба божага (імя) пужанню не бываць. Маць Прачыстая на Сіанскай гарэ гуляла, гэтаму рабу божаму (імя) пужанне ўнімала». (Маг. р-н.).

«Звычайна раптоўную хваробу дзіцяці прыпісваюць пярэпалаху; улякнуўся», кажуць, і тады існуюць два спосабы лекаў. Трэба ўзяць у нейкую пасудзіну вады і праз рэшата прасяваць на яе попел накрыж. Потым дзіця ў той вадзе выкупаць і ваду выліць у нейкім месцы, дзе ніхто не ходзіць. Калі гэта не дапаможа, другі спосаб такі: спячы шэсць маленькіх булачак хлеба, пакласці іх хвораму дзіцяці на жываток і качаць, аж пакуль на хлебе не выскачаць нейкія валасы — то зляк выходзіць; тады хлеб даюць ухапіць сабаку, а дзіця — папраўляецца».

Спалох (зляк) выганялі ці адпалохвалі па-рознаму: «Пуд-пудзішча выгавараваю я цябе з буйной галавы, з русага валосся, з хуткага сэрца, з жылаў, костак і суставаў. Рабу божаму (імя), святы дзянёчак, стань на дапамогу. Святы Мікола, стань на дапамогу. Святы Пятро, стань на дапамогу. Святы Павел, стань на дапамогу. Святы Ілля, стань на дапамогу. Святы Спас, стань на дапамогу. Святы Пакроў, стань на дапамогу. Святы Кузьма, стань на дапамогу. Святы Дзям'ян, стань на дапамогу. Пуд-пудзішча, шлю цябе на мхі, на балоты, на гнілыя калоды, на белыя камяні, на ракітавы куст. Амінь». Гаварыць тры разы і вечарам, і днём, і раніцай. (Кір. р-н.).

**Аляксей НЕНАДАВЕЦ.**

***(Працяг будзе.)***

Ф.СП-1 Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь

**АБАНЕМЕНТ** на газету ЗВЯЗДА з бясплатнымі ўкладкамі: «ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

(індэкс выдання)

Колькасць камплектаў

на 2009 год па месяцах

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | | |

Каму
(прозвішча, ініцыялы)
Куды
(адрас)
(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)

**ДАСТАВАЧНАЯ КАРТКА** на газету ЗВЯЗДА з бясплатнымі ўкладкамі: «ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

ПВ | месца | літар

(індэкс выдання)

| Кошт | падпіскі | ______ руб. | Колькасць камплектаў | |
|---|---|---|---|---|
| | пераадрасоўкі | ______ руб. | | |

на 2009 год па месяцах

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | | |

Каму
(прозвішча, ініцыялы)
Куды
(адрас)
(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)

Калі вы падпісаліся на газету **«Звязда» на I квартал або 1-е паўгоддзе 2009 года** — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце яе **да 5 студзеня** ў рэдакцыю на адрас: **220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А**.

Падпісчык можа выйграць у якасці прызоў гадзіннікі, майкі, бейсболкі, тэлевізары «Віцязь», печ-СВЧ і халадзільнік. Розыгрыш прызоў праводзіцца **8 студзеня 2009 г.**, вынікі публікуюцца ў газеце «Звязда» **да 18 студзеня 2009 г.**

Атрымаць прыз можна ў рэдакцыі **да 20 сакавіка 2009 г.** пры прад'яўленні квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на I квартал або 1-е паўгоддзе 2009 года і пашпарта. Дастаўку тэлевізараў, печы-СВЧ і халадзільніка ажыццяўляе рэдакцыя. **Пасля 20 сакавіка** выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца.

**Больш падрабязна правілы гульні «Падпішыся на «Звязду» чытайце ў нумары газеты за 4 лістапада 2008 года. Удачы ў гульні!**

Тэрмін праводзення гульні — з 04.11.08 па 14.01.09.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 1223 ад 30.10.08, выдадзена Міністэрствам гандлю РБ.

3 Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на I квартал або 1-е паўгоддзе 2009 года

Прозвішча, імя, імя па бацьку ____________

Падпіска аформлена і аплачана ў ____________
(аддзяленне сувязі)

____________ на I кв. або 1–е паўг. 2009 года

Хатні адрас і тэлефон ______ (індэкс) ____________

Удачы ў розыгрышы!

## ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ КОНКУРСЕ

**по продаже предприятия как имущественного комплекса и права заключения договора аренды земельного участка**

Копыльский районный исполнительный комитет **23 декабря 2008 года** в 15.00 по адресу: г. Копыль, пл. Ленина, д. 6 проводит открытый конкурс по продаже коммунального производственного унитарного предприятия «Копыльский завод железобетонных изделий» как имущественного комплекса в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 25 февраля 2008 г. № 113 и право заключения договора аренды земельного участка, необходимого для его обслуживания, составляющие единый предмет конкурса.

На торги выставляется коммунальное производственное унитарное предприятие «Копыльский завод железобетонных изделий» как имущественный комплекс, расположенное по адресу: Минская область, Копыльский район, ст. Тимковичи и право заключения договора аренды земельного участка, отведенного для его обслуживания, площадью 26,9684 га сроком на 99 лет.

Начальная цена предмета конкурса составляет 1 884 982 581 рубль, в том числе имущественного комплекса – 1 826 328 357 рублей и право заключения договора аренды земельного участка – 58 654 224 рубля.

Сумма задатка предмета конкурса 56 000 000 рублей.

**Условия конкурса:**

наличие инвестиционного проекта, прошедшего в установленном законодательством порядке государственную комплексную экспертизу, по развитию организации-покупателя в части использования приобретаемого предприятия как имущественного комплекса;

реализация инвестиционного проекта, социальных программ по поддержке коллектива работников;

сохранение рабочих мест на период погашения задолженности КУП «Копыльский завод железобетонных изделий», создание дополнительных рабочих мест в соответствии с инвестиционным проектом и благоприятных условий труда работников;

принятие на себя неисполненных обязательств КУП «Копыльский завод железобетонных изделий» по уплате налогов, сборов (пошлин), процентов, взимаемых в соответствии с налоговым и таможенным законодательством, бюджетным ссудам, займам, иным обязательным платежам в республиканский и местные бюджеты (включая государственные целевые бюджетные фонды), а также по платежам в государственный внебюджетный Фонд социальной защиты населения Министерства труда и социальной защиты, по экономическим санкциям, уплате штрафов и начисленных пеней за нарушения законодательства, иным неисполненным обязательствам;

заключение договора аренды земельного участка;

заключение договора о выполнении мобилизационного задания на особый период;

сохранение профиля предприятия на срок не менее 20 лет;

заключение договора безвозмездного пользования имуществом жилым домом расположенным по адресу: д. Тимковичи, ул. Слуцкая, д. 177, находящегося в собственности Копыльского района.

Приоритетным условием для определения победителя конкурса является направление наибольшей суммы инвестиций на модернизацию производства приобретаемого имущественного комплекса.

Численность работающих на КУП «Копыльский завод железобетонных изделий» составляет 24 человека. Общая сумма обязательств предприятия на дату публикации извещения о продаже имущественного комплекса составляет 878 184 897 рублей. Убыток составляет 177 148 585 рублей. Претензии кредиторов к КУП «Копыльский завод железобетонных изделий» принимаются до 19 декабря 2008 года. Предприятие не имеет паев и акций в активах других юридических лиц. Основной вид выпускаемой продукции – строительные материалы (бетонные, железобетонные изделия, товарный бетон, стеновые блоки).

Продавец имущественного комплекса и арендодатель земельного участка – Копыльский районный исполнительный комитет.

По итогам проведения конкурса Копыльский районный исполнительный комитет выносит решение о предоставлении победителю права заключения договора аренды земельного участка.

К участию в конкурсе допускаются: юридические лица, в том числе иностранные юридические лица, представившие в Копыльский райисполком в сроки, указанные в извещении, следующие документы:

заявление на участие в конкурсе (по установленной форме);

заверенные банком копии платежных поручений о внесении размера задатка и платы за участие в конкурсе;

предложения в письменной форме по выполнению условий конкурса, в том числе и по выполнению приоритетного условия, запечатанные в отдельном конверте, который передается участником конкурса в конкурсную комиссию не позднее 22 декабря до 17.00;

юридическими лицами – резидентами Республики Беларусь – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), нотариально заверенные копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации;

иностранными юридическими лицами – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в конкурсе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык, представителем иностранного юридического лица дополнительно представляется легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданной обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык, а также паспорт или иной документ, удостоверяющий личность;

подписывание соглашение о правах и обязанностях сторон.

**Победитель обязан** в течение 2-х рабочих дней с даты проведения конкурса:

возместить расходы связанные с:

- подготовкой и проведением конкурса в размере 5 базовых величин;

- формированием и регистрацией земельного участка;

внести плату, взимаемую за право заключения договора аренды земельного участка в размере 10 % от причитающейся суммы за право заключения договора аренды.

После внесения победителем конкурса названных платежей продавец заключает договор купли-продажи имущественного комплекса, арендодатель – договор аренды земельного участка.

Оплата за имущественный комплекс производится в рассрочку с уплатой 1-го взноса в размере 10 % от стоимости имущественного комплекса в течение 5-ти рабочих дней со дня проведения конкурса.

Оставшиеся платежи вносятся в течение 6-ти лет с ежемесячным погашением в равных долях без индексации платежей.

Государственная регистрация предприятия как имущественного комплекса, договор купли-продажи должны быть осуществлены в 2008 году.

Порядок проведения конкурса определен в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 25 февраля 2008 года № 113 и решением Копыльского районного исполнительного комитета от 30.06.2005 года № 491 «О проведении аукционов и конкурсов по продаже объектов и акций, находящихся в собственности Копыльского района».

Все расчеты по сумме задатка производятся путем перечисления их на расчетный счет финансового отдела Копыльского райисполкома № 3602617000890 в ф-ле № 609 ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Копыль, код 516, назначение платежа 04002, УНП 600018318.

Заявки на участие в конкурсе принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: г. Копыль, пл. Ленина, д. 6, к. 36, тел. 51 1 37. Последний день подачи заявок **22 декабря 2008 г.** до 17.00.

---

*КУП «Минский областной центр учета недвижимости»*
*по поручению Щомыслицкого сельисполкома Минского района*

## ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

**по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов в Минском районе:**

| № лота | Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь земельного участка | Наличие инженерных сетей | Расходы по подготовке документации (рублей) | Начальная цена (рублей) | Задаток (рублей) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | д. Городище, 623688001601000297 | 0,1200 га | сети электроснабжения | 1 102 324 | 14 516 328 | 1 450 000 |
| 2 | д. Городище, 623688001601000295 | 0,1200 га | | 722 783 | 14 482 188 | 1 440 000 |
| 3 | д. Городище, 623688001601000298 | 0,1300 га | | 1 139 986 | 15 726 022 | 1 570 000 |
| 4 | д. Городище, 623688001601000296 | 0,1291 га | | 694 923 | 15 580 421 | 1 550 000 |
| 5 | д. Богатырево, 623688001601000291 | 0,1529 га | сети электро-, газо-, водоснабжения | 731 438 | 23 502 228 | 2 350 000 |

***Примечание:*** *земельные участки в д. Городище имеют ограничения в использовании земель (водоохранная зона ручья № 9).*

Задаток перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», г. Минск, МФО 153001357, УНП 690324015, КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы, связанные с подготовкой документации, необходимой для проведения аукциона. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с документацией и земельными участками. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **23.12.2008 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, д. 5, ком. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **17.12.2008 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, д. 5, ком. 326.

**Контактный телефон (8 017) 224 61 34. Сайт в интернете: www.rlt.by.**

*КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015*

---

*Голоцкий сельский исполнительный комитет Пуховичского района (Продавец) совместно с КУП «Минский областной центр учета недвижимости»*

## ПРОВОДЯТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

**по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов в д. Лысовщина, д. Хозянинки Пуховичского района:**

| № лота | Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь земельного участка | Наличие инженерных сетей | Расходы по подготовке документации, необходимой для проведения аукциона | Начальная цена (бел. руб.) | Задаток (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Пуховичский район, д. Хозянинки, ул. В. Мысливца, № 624482506101000112 | 0,2148 га | электроснабжение | 597 730 | 1 269 640 | 120 000 |
| 2 | Пуховичский район, д. Хозянинки, ул. В. Мысливца, № 624482506101000111 | 0,2090 га | | 597 730 | 1 235 357 | 120 000 |
| 3 | Пуховичский район, д. Хозянинки, ул. В. Мысливца, № 624482506101000110 | 0,1886 га | | 597 730 | 1 114 777 | 110 000 |
| 4 | Пуховичский район, д. Хозянинки, ул. Яновка, № 624482506101000122 | 0,1684 га | электроснабжение, водопровод | 610 645 | 1 293 817 | 120 000 |
| 5 | Пуховичский район, д. Лысовщина, ул. Вишневая, № 624482502601000090 | 0,1169 га | электроснабжение | 592 551 | 690 973 | 60 000 |

**Примечание — Лоты № 1—3 имеют ограничения в использовании земель (водоохранная зона канала);*

Лот № 5 (водоохранная зона реки Свислочь, зона санитарной охраны подземных источников водоснабжения хозяйственно-питьевого назначения).

Задаток перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», г. Минск, МФО 153001357, УНП 690324015, КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы, связанные с подготовкой документации, необходимой для проведения аукциона (по каждому лоту). Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с документацией и земельными участками. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **23.12.2008 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **17.12.2008 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул.Чкалова, д. 5, ком. 326.

**Контактный телефон (8 017) 224 61 34. Сайт в интернете: www.rlt.by.**

*КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015*

---

Минский городской центр недвижимости

## УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»

**24 декабря 2008 г. проводит открытый аукцион с условиями № 2-У-08 на право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений)**

**Вид аукциона:** открытый (на повышение цены продажи).

**Предмет аукциона:** право проектирования и строительства капитального строения (здания и сооружения) на предоставляемом земельном участке, на котором находятся объекты недвижимости, подлежащие сносу.

Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.

На торги выставляется право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений) в г. Минске по 10 земельным участкам, предоставляемых в аренду сроком на 5 лет:

| Лот № | Место расположения земельного участка | Площадь земельного участка, га | Функциональное назначение земельного участка | Начальная цена предмета аукциона, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. | Расходы на подготовку документации для проведения аукциона, бел. руб. | Наличие обременений | Ориентировочный размер убытков, причиняемых изъятием земельного участка и сносом расположенных на нем объектов недвижимости, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | ул. Казинца | 1,3608 | Многофункциональный торгово-общественный комплекс | 1 454 774 671 | 72 738 740 | 12 723 342 | малоэтажная застройка | 2 702 844 960 |
| 2 | ул. Каховская – ул. Червякова – Сморговский тракт | 1,2581 | Жилой дом повышенной комфортности | 1 481 702 834 | 74 085 150 | 17 393 613 | усадебная застройка | 2 064 820 630 |
| 3 | ул. Бельского – ул. Пономаренко – пер. 3-й Харьковский – пер. 2-й Силикатный | 3,2649 | Квартал жилой застройки повышенной комфортности с помещениями общественного назначения | 3 413 235 911 | 170 661 800 | 24 568 361 | усадебные жилые дома и продовольственный магазин | 3 101 070 438 |
| 4 | ул. Пономаренко – ул. Я. Мавра | 3,3874 | Многоэтажные жилые дома повышенной комфортности со встроенными помещениями общественного назначения | 3 510 287 809 | 175 514 400 | 15 410 860 | 1-3-этажная жилая застройка | 4 443 465 157 |
| 5 | ул. Кольцова – пер. 1-й Кольцова | 0,5066 | Объект многофункционального общественного назначения | 601 428 630 | 30 071 440 | 7 250 718 | малоэтажная застройка | 551 646 905 |
| 6 | ул. 3-го Сентября – ул. Пинская | 0,4359 | Объект многофункционального общественно-производственного назначения | 499 713 925 | 24 985 700 | 7 505 325 | малоэтажные жилые дома | 631 133 966 |
| 7 | ул. Пономаренко – ул. Я. Мавра | 0,2336 | Объект административно-производственного назначения | 224 516 735 | 11 225 840 | 2 627 099 | нежилые строения | – |
| 8 | пер. 5-й Брестский, пер. 1-й Южный | 3,9253 | Объект многофункционального общественно-производственного назначения с гараж-стоянкой | 3 776 716 063 | 188 835 810 | 20 092 266 | усадебные жилые дома | 1 802 442 264 |
| 9 | ул. Солтыса – Ваупшасова | 1,43 | Торговый центр | 1 735 684 236 | 86 784 220 | 7 062 045 | индивидуальные жилые дома | 386 602 640 |
| 10 | ул. Толстого – Дружная – Вокзальная | 2,9264 | Многофункциональный общественно-торговый комплекс | 4 053 212 661 | 202 660 640 | 26 268 469 | 1-3-этажная нежилая застройка | 5 287 112 841 |

Инженерное развитие инфраструктуры застраиваемой территории участков осуществляется в соответствии с техническими условиями на инженерно-техническое обеспечение соответствующего объекта, выданными эксплуатирующими и согласующими организациями (согласно перечню, установленному Минским горисполкомом).

Аукцион состоится **24 декабря 2008 года в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Для участия в аукционе необходимо:

**внести задаток** в размере 5 % от начальной цены заявленного лота (лота с наибольшей стоимостью – в случае участия в торгах по нескольким лотам), перечисляемый на расчетный счет № 3641000000016 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка – 795, УНП – 100690830, назначение платежа – 04002, получатель – Финансовое управление Мингорисполкома;

**представить в адрес УП «Минский городской центр недвижимости» следующие документы:**

заявление на участие в аукционе установленной формы;

заверенную банком копию платежного документа, подтверждающего внесение задатка в установленном размере;

подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, в соответствии с которым участник аукциона, победивший в торгах, либо которому земельный участок предоставляется по начальной цене в случаях, предусмотренных законодательством Республики Беларусь, обязан произвести оплату организатору аукциона за его организацию и проведение в размере 4 % от начальной цены предмета торгов и 5 % от суммы превышения цены продажи соответствующего лота над его начальной ценой.

Дополнительно представляется:

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представителем индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе представители индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

**Прием документов** для участия в аукционе начинается с **9.00 24 ноября 2008 года** и заканчивается в **15.45 19 декабря 2008 года.**

Торги в отношении каждого земельного участка проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов по каждому выставленному лоту признается участник, предложивший наиболее высокую цену.

Победители торгов (участники аукциона, которым земельные участки предоставляются по начальной цене в случаях, предусмотренных законодательством) обязаны:

в течение 10 рабочих дней со дня принятия Минским горисполкомом решений о предоставлении им соответствующих земельных участков:

- внести плату за предмет аукциона (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения);

- возместить Минскому горисполкому расходы по подготовке документации для проведения аукциона;

в течение 10 рабочих дней со дня оформления (подписания) в установленном порядке протокола о результатах аукциона:

- произвести оплату организатору аукциона за его организацию и проведение, включающую возмещение расходов, связанных с подготовкой и проведением аукциона, в размере 4 % от начальной цены предмета торгов и 5 % от суммы превышения цены продажи соответствующего лота над его начальной ценой.

После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, Минский горисполком заключает с победителем аукциона (в установленных законодательством случаях – с его участником) договор на реализацию права проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений) и договор аренды.

Оплата стоимости предметов аукциона осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли. По заявлению победителя аукциона Минский горисполком может предоставить рассрочку по внесению платы за предмет аукциона в порядке, установленном соответствующей инструкцией, утвержденной решением Мингорисполкома от 05.06.2008 № 1308.

После истечения срока аренды земельного участка (5 лет), предоставленного по результатам аукциона, лицо, которому он предоставлен в установленном порядке, обращается в адрес Минского горисполкома с заявлением о продлении срока аренды соответствующего участка (заключении нового договора аренды), на основании которого, по решению исполкома ему предоставляется земельный участок на указанный в заявлении срок, но не более чем на 99 лет, при условии внесения этим лицом платы за право аренды земельного участка, рассчитанной на основании его кадастровой стоимости с применением коэффициентов, установленных Советом Министров Республики Беларусь исходя из сроков аренды земельных участков.

Всем желающим предоставляется возможность ознакомления с землеустроительной и градостроительной документацией по соответствующим земельным участкам, а также приобретения лотовой документации.

В дни и время, указанные в объявлении, размещаемом на информационном стенде (фойе офиса УП «Минский городской центр недвижимости»: г. Минск, ул. К. Маркса, 39), организатором торгов предоставляется транспорт для обеспечения осмотра земельных участков желающими принять участие в аукционе.

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе, осуществляются по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. № 4, 6.

**Контактные телефоны: + 375 (17) 226 16 72, + 375 (17) 227 40 22.**

**Дополнительная информация о выставленных на аукцион участках, а также условия участия в торгах и бланки требуемых документов размещены на официальном сайте организатора торгов www.mgcn.by.**

УНП 190398583

---

*ОАО «Минскконтракт» (продавец) совместно с УП «Минский городской центр недвижимости» (организатор аукциона)*

## ПОВТОРНО ПРОВОДЯТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

**по продаже зданий, сооружений и иного имущества, расположенного на ул. Смоленская, 51 в г. Минске, единым лотом. В состав лота входит следующее имущество:**

| № п/п | Наименование объектов | Инв. № |
|---|---|---|
| 1 | Административное здание (общая площадь – 162,5 кв.м.) | 565 |
| 2 | Здание склада (общая площадь – 362,9 кв. м) | 567 |
| 3 | Здание склада (общая площадь – 858,3 кв. м) | 568 |
| 4 | Здание склада (общая площадь – 193,7 кв. м) | 569 |
| 5 | Здание склада (общая площадь – 731,5 кв. м) | 570 |
| 6 | Здание бытового назначения (общая площадь – 96,1 кв. м. | 571 |
| 7 | Открытая площадка (площадь – 0,9 га) | 572 |
| 8 | Навес (общая площадь – 182 кв. м) | 573 |
| 9 | Водопровод наружный (длина – 230 м) | 574 |
| 10 | Наружное освещение | 941 |
| 11 | Ограждение железобетонное внешнее с воротами | 942 |
| 12 | Канализация бытовая (длина – 14 м) | 943 |
| 13 | Насаждения | 944 |
| 14 | Водосчетчик Вір-М | 212 |
| 15 | Прибор учета тепла ФС-31М1 | 1 |

Площадь земельного участка – 1,2031 га, кадастровый номер 500000000001001893. Отвод земельного участка будет производиться Минской городской землеустроительной и геодезической службой.

Начальная цена лота – 4 123 956 300 белорусских рублей без учета НДС.

Продаваемое имущество обременено договорами аренды.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, условиями проведения аукциона; нотариально заверенные копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации; соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенные банком копии платежных поручений, подтверждающих внесение задатка и платы за участие в аукционе в размере 4 базовых величин; а также иные документы в соответствии с условиями проведения аукциона.

Задаток в размере 400 000 000 белорусских рублей и плата за участие в аукционе перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, код 153001331, УНП 190398583.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый объект. Порядок проведения торгов указан в условиях проведения аукциона.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем аукциона подписывается в течение 10 календарных дней с даты проведения аукциона. Оплата объекта осуществляется в течение 30 календарных дней с даты проведения аукциона. Аукцион состоится **08 декабря 2008 года** в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Заявление на участие в аукционе и необходимые документы принимаются по **05 декабря 2008 года** до 16.45 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефон для справок: 227 48 36 —**
**УП «Минский городской центр недвижимости».**

---

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**по продаже недвижимого имущественного комплекса – по продаже комплекса сооружений, в состав которого входят свинарник с двумя пристройками, скотоубойный цех с сараем (весовой), расположенного по адресу: Брестский район, д. Тельмы-2.**

Брестское Районное потребительское общество (Продавец) совместно с ЧУП «Белкооппроект» Белкоопсоюза (Организатор аукциона) проводят открытый аукцион по продаже недвижимого имущественного комплекса – по продаже комплекса сооружений, в состав которого входят свинарник с двумя пристройками, скотоубойный цех с сараем (весовой), расположенного по адресу: Брестский район, д. Тельмы-2.

**Состав имущественного комплекса:**

| Наименование строения, год постройки | Характеристика строения | Общая площадь строения |
|---|---|---|
| здание скотоубойного цеха, 1965 | фундамент бетонный; стены кирпичные, силикатные блоки; кровля рулонная, шиферная; электроснабжение – скрытая проводка; внутренняя отделка – штукатурка, плитка, покраска; теплоснабжение центральное; водоснабжение – от собственной артскважины; канализация – местный выгреб; вентиляция естественная | 222,2 $м^2$ |
| здание свинарника, 1982 | фундамент бетонный; стены – силикатные блоки; кровля шиферная; электроснабжение – открытая проводка; внутренняя отделка – известковая покраска; теплоснабжение – от собственной котельной; водоснабжение – от собственной артскважины; канализация – местный выгреб; вентиляция естественная | 305 $м^2$ |

Общая площадь земельного участка для содержания и обслуживания скотобойного пункта составляет 0,5576 га, расположенного по адресу: Брестская область, Брестский район, д. Тельмы-2.

Начальная цена – 160 000 000 белорусских рублей с НДС.

Размер задатка составляет 10 % от начальной цены, сумма задатка 16 000 000 белорусских рублей перечисляется на расчетный счет организатора аукциона – р/с 3012000003910 в ОАО «АСБ Беларусбанк», филиал 510 МФО 153001603, УНН 100105073 ОКПО 01790429 (в платежном поручении в графе «Назначение платежа» указывать: «Задаток согласно Условий проведения аукциона № 21 от 31.10.2008 г., без НДС»).

Аукцион состоится **22.12.2008 года** в 14.00 по адресу: г. Брест, ул. Нефтяная, 10.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **19.12.2008 г.** включительно с 8.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, пр. Победителей, 17, 12-й этаж, каб. 1209.

Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.

Плата за участие в аукционе составляет 257 290 белорусских рублей и перечисляется участниками на расчетный счет организатора аукциона (в платежном поручении в графе «Назначение платежа» указывать: «Плата за участие в аукционе согласно Условий проведения аукциона № 21 от 31.10.2008 г., в том числе НДС 18 %).

Вознаграждение организатора аукциона составляет 5 % от продажной стоимости объекта и уплачивается победителем аукциона (помимо оплаты за объект) на расчетный счет организатора аукциона в течение 3-х рабочих дней с даты проведения аукциона.

Для участия в аукционе юридическое лицо, гражданин или индивидуальный предприниматель (лично или через своего представителя) в установленный в извещении о проведении аукциона срок обязан предоставить следующие документы в адрес организатора аукциона:

- заявление на участие в аукционе;

- заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка на расчетный счет организатора аукциона;

- юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь – доверенность представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), нотариально удостоверенные копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации;

- заверенную банком копию платежного поручения, подтверждающую внесение платы за участие в аукционе в размере 257 290 белорусских рублей;

- индивидуальным предпринимателем – нотариально удостоверенную копию свидетельства о государственной регистрации;

- юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим его банком или иной кредитно-финансовой организацией с заверенным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык;

- представителем физического лица – резидента Республики Беларусь – нотариально заверенную доверенность, паспорт;

- физическим лицом – паспорт.

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 дней с даты проведения аукциона. Право собственности на объект переходит от Брестского Районного Потребительского общества к победителю аукциона после полного расчета по договору купли-продажи объекта.

Объект продается без условий.

Всем желающим предоставляется возможность предварительного ознакомления с объектом.

**Контактные телефоны: (8017) 203 28 42; 226 94 83.**

## СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



# ЖЫЛА-БЫЛА ЖАНЧЫНА...

Казкі для дарослых



ЖЫЛА ў маленькім гарадку, дзе ўсе адзін аднаго ведаюць. Таму я назаву яе, напрыклад, Галінай Васільеўнай. Галіна Васільеўна займала сціплую пасаду прадаўца ў мясцовым гастраноме. Зарплатай пахваліцца не магла, але «сёе-тое» на жыццё перападала. А жыццё было не тое што цяжкім, але і не лёгкім. Адным словам, жаночым. Уставала Галіна Васільеўна рана — гадзін у пяць. Даглядала жывёлу, насыпала корм курам, гатавала сняданак, абед, а заадно і вячэру, мыла бялізну і збірала дзяцей у школу. Іх у Галіны Васільеўны было двое — дзяўчынкі пятнаццаці і шаснаццаці гадоў... Быў яшчэ і муж, Гена, які працаваў бензазапраўшчыкам у мясцовым ПТВ. Гена даўно і ўшчыльную сябраваў з гарэлкай, і таму з ім часта здараліся ўсялякія недарэчнасці. У сям'і Гена быў баластам, дзеці хоць і называлі яго татам, але ў разлік не бралі. І ўвогуле ў вертыкальным становішчы бачылі вельмі рэдка. Цвярозым тата пачынаў «качаць правы», успамінаў, «хто ў хаце гаспадар», і з гэтай нагоды распускаў рукі. Даставалася ўсім: і маці, і дзяўчаткам, і нават свекрыві Галіны Васільеўны, якая таксама жыла разам з імі.

Галіна Васільеўна не кляла сваё жыццё. Яна даўным-даўно, яшчэ з дзяцінства, прывыкла пераадольваць цяжкасці (расла старэйшай у шматдзетнай сям'і), і таму была ўпэўненая, што іншага жаночага лёсу проста не бывае. Махнула рукой на здароўе, знешні выгляд, асабістае шчасце. І прысвяціла сябе дзецям. Яна, можна сказаць, адна ўтрымлівала сваё немаленькае сямейства. Летам да ночы не вылазіла з агарода — кожны кавалачак зямлі быў у яе дагледжаны і меў сваё прызначэнне. Зімой шыла і вязала. Дзеці былі сытыя і выглядалі не горш за астатніх. А калі якая з дзяўчат апранала світар ці сукенку, звязаныя мамай, дык і ўвогуле людзі на вуліцы аглядаліся.

Сама Галіна Васільеўна даношвала колішнія спадніцы і кофты, нешта распорвала, нешта перарабляла — то каўнерык, то манжэты, то складачкі... Новых рэчаў сабе амаль што не купляла, лічыла гэта недазволенай раскошай. А калі і купляла — праз дзень-другі аддавала старэйшай, Ірынцы. Тая хоць і крывілася незадаволена — маўляў, не моднае — але нічога, брала. Нават на дыскатэкі свае апранала.

Свякроў з пенсіі не аддавала ў сям'ю ні капейкі, жыла на поўным Галіным утрыманні. «На смерць збіраю», — тлумачыла, вяртаючыся з банка. Колькі Галіна Васільеўна памятала, баба Ганна збірала грошы «на смерць». Нават калі не хапала на жыццё, калі Генадзь хітрыкамі ці сілай забіраў у жонкі апошняе. «Памру — усё вам застанецца», — абнадзейвала баба Ганна, выбіраючы з агульнай міскі лепшы кавалак. Галя і не пярэчыла...

Так магло б цягнуцца да бясконцасці, калі б аднойчы Генадзь, вяртаючыся прыцемкамі ад сябра, не зваліўся без прытомнасці пад чужой агароджай на чужой вуліцы. Ноччу, як на тое, узяўся добры мароз (справа адбывалася позняй восенню). І калі на досвітку нейкія людзі выклікалі «хуткую дапамогу», выратоўваць яго было позна. Галава сямейства пражыў нядоўга, затое пасля пахавання яшчэ з паўгода цягаліся да Галіны яго сябры і патрабавалі вярнуць хто «пяцёрку», хто «дзясятку». Яна аддавала апошняе, спадзеючыся, што калі-небудзь жа гэта ды скончыцца...

ПРАЙШЛІ зіма і вясна, пачалося лета. О, яна ніколі не забудзе гэта лета, такое казачнае, цудоўнае і цёплае, такое жорсткае і халоднае... Пасля таго, як засталася адна, Галіна Васільеўна адчула (даруй, Божа, за гэтыя словы) нейкую палёгку. Быццам адчыніліся дзверы цёмнага і цеснага пакоя, у якім яна сядзела доўгія гады, і чыясьці благаславенная рука выпусціла яе на волю. І якой жа цудоўнай аказалася гэтая воля! Свякруха яшчэ нешта шыпела са свайго кутка, ды толькі Галя стала іншая. Быццам бы нічога знешне не змянілася — той жа строгі распарадак і жорсткая эканомія, той жа хлеў з жывёлай, тыя ж хатнія клопаты. Але ўсе, хто размаўляў з ёю тады, у адзін голас сцвярджалі: Галю нібы падмянілі. Расцвіла, папрыгажэла і (чаго ніколі не назіралася раней) пачала падмалёўваць вусны. Меркаванні суседак былі не далёкія ад праўды. Галіна Васільеўна закахалася.

Пазнаёміліся, зразумела, не ў рэстаране, не на пляжы і нават не ў бібліятэцы. Прыйшоў чалавек у магазін, папрасіў два пакеты малака. І ўжо толькі з-за гэтага звярнуў на сябе ўвагу. «Дзівак нейкі, — падумала Галя. — Відаць адразу, што камандзіровачны. Нашы мужыкі малако не п'юць».

«Дзівак» прыходзіў яшчэ некалькі разоў, аднойчы — перад самым закрыццём. «Спазніліся, — ветліва сказала яна яму, — ужо зачыняемся». І толькі потым заўважыла, што ў яго руках няма пакупак.

Мужчыну звалі Віктар. І апынуўся ён у маленькім гарадку менавіта тады, калі яго з'яўленне было такім неабходным. У свае сорак з «хвосцікам» Галіна Васільеўна ўпершыню адчула сябе жанчынай — любімай і жаданай. Дома яна нікому нічога не расказвала — дастаткова было плётак, якія штодзённа прыносіла «на хвасце» свякроў. Галя ў адказ усміхалася ці жартавала. Толькі аднойчы, пачуўшы ад бабы Ганны ў свой адрас брыдкае слова, не стрымалася, выказала ўсё, што накіпела. Свякруха зачынілася ў сваім пакоі і, не звяртаючы ўвагі на абразы, доўга праклінала нявестку. Аднак вячэраць выйшла. Прыкладна з той пары Галіна Васільеўна і пачала заўважаць перамену ў дзецях. Ірына перайшла ўжо на другі курс інстытута. Света скончыла школу, збіралася вучыцца на цырульніка... Высвятленне адносінаў адбылося аднойчы вечарам, калі ўся сям'я была ў зборы. Галя толькі вярнулася з работы, ледзь дацягнула дзве вялізныя сумкі з прадуктамі. Віктар і хацеў дапамагчы — не дазволіла: маўляў, вось будзе суседзям забава і падстава для плётак... На кухні, стоячы ля халадзільніка і выкладваючы пакунак за пакункам, нешта замурлыкала сабе пад нос (калі такое здаралася?). І раптам пачула словы, якія апяклі душу. «Яна яшчэ спявае!» — гаварыла старэйшая дачка малодшай. — «Хутка на вуліцу не выйдзеш, — адказвала тая, наўмысна павышаючы голас. — Суседзі засмяюць».

Галіна Васільеўна — Галінка, Галіначка, як называў яе Віктар, — ішла ў суседні пакой, як на эшафот.

«Я хачу вам усё патлумачыць», — сказала на парозе і... наткнулася на каменныя твары. Лепш бы яна прамаўчала. Дык не — хацелася выгаварыцца. Хацелася, каб зразумелі. Не хто-небудзь, а дзеці, самыя любімыя і родныя. І яна расказала ім пра Віктара. Што жыве і працуе ў абласным цэнтры, што разведзены, што гадуе дзесяцігадовага сына. Што добры і далікатны, пяшчотны і клапатлівы. Што зрабіў ёй прапанову і папрасіў пераехаць да яго. Што яна не збіраецца іх кідаць, а будзе прыязджаць кожныя выхадныя, а можа і часцей — прыбіраць у хаце, мыць бялізну, палоць градкі і рабіць закаткі на зіму. Яна ўладкуецца ў гэтым абласным цэнтры на працу, а хутчэй — на дзве, і амаль усе грошы будзе пакідаць ім.

Але дарослыя дочкі прынялі дарослае рашэнне. Паставілі ўльтыматум: або мы, або твой Віктар. Выбірай.

ГАЛІНЕ Васільеўне па начах сталі сніцца кашмары. Падскочыў ціск, сэрца пачало збівацца з рытму. Віктар прыязджаў кожны тыдзень. Ён разумеў яе, як ніхто. Не прыспешваў. Проста чакаў (даволі рэдкая якасць для мужчыны — умець чакаць). У сваёй хаце Галіна Васільеўна натыкалася на непрабівальную сцяну ўпартага маўчання. Усё лета дзяўчаты амаль не паказваліся дома, падкрэсліваючы гэтым свой пратэст. А яна баялася павысіць на іх голас, саромелася спытаць, чаму так позна вяртаюцца. Уяўляла, што яны могуць адказаць. Толькі з прывычнай пакорлівасцю лёсу цягала вёдрамі ваду з калонкі, палівала шэрую ад спякоты зямлю.

Калі-небудзь гэта павінна было скончыцца. І скончылася. Галіна Васільеўна сабрала самыя неабходныя рэчы, а больш прыгожыя распіхала дзяўчатам па шафах. Пакінула на стале грошы, папрасіла ўсіх суседзяў дапамагаць дзецям і... паехала. Колькі размоў пасля гэтага было... Многія яе асуджалі. Амаль што ўсе. А можна сказаць, што і ўсе. Як так — ад родных дзяцей, ад роднай хаты? Дочкі ў першы яе прыезд не адчынілі дзверы. Прадукты і падарункі прыйшлося пакінуць на ганку... А потым яе бачылі часта. І ніколі — з пустымі рукамі. Быццам бы і не ад'язджала нікуды Галіна Васільеўна: то па выхадных стаяла на рынку (прадавала сваю бульбачку), то таўклася на агародзе, а пазней, калі Ірына нарадзіла, хадзіла па вуліцы з калясачкай.

...Галіна прыкметна схуднела, часта скардзіцца на галаўны боль. Са сваім Віктарам яна жыве па-ранейшаму, але пры сустрэчы са знаёмымі чамусьці адводзіць вочы ўбок — быццам усё яшчэ лічыць сябе вінаватай. Пагаворваюць, што яна збіраецца вярнуцца назад назаўсёды. Не можа дараваць сабе свайго шчасця...

**Наталля УЛАДЗІМІРАВА.**

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 7.50 | 16.01 | 8.11 |
| Віцебск — | 7.46 | 15.45 | 7.59 |
| Магілёў — | 7.41 | 15.51 | 8.10 |
| Гомель — | 7.30 | 15.54 | 8.24 |
| Гродна — | 8.04 | 16.17 | 8.13 |
| Брэст — | 7.58 | 16.24 | 8.26 |

**Месяц**

*Апошняя квадра.*
*Месяц у сузор'і Шаляў.*

**Імяніны**

*Пр. Матроны, Аляксандра, Аляксея, Антона, Дзмітрыя, Івана, Канстанціна, Кірылы, Парфірыя.*
*К. Цэцыліі, Марка, Сцяпана.*

## НАДВОР'Е на заўтра




### ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

**Сканворд (15 лістапада). Па гарызанталі:** Нёман. Смятанка. Жалеза. Каток. Арфа. Тара. Аер. Бор. «Аякс». Рэастат. Ток. Асоба. Азот. Дартс. Марабу. Ананке. Нос. Дух. Сацін. Эстэт. Лато. Цуд. Ваза. Кіраса. Мінус. Палата. Мазут. Гало. Бра. Асфальт. **Па вертыкалі:** Серабро. Сашэ. Медзь. Фраза. Рандэву. Штат. Кутас. Нож. Смех. Каюта. Атам. Алтар. Лага. Табло. Абраза. Зло. Тула. Ява. Карта. Сок. Атос. Мара. Рака. Званіца. Кіо. Бонус. Колас. Трус. Дамкрат.

# Вучоныя вывелі формулу ідэальнай тэлефоннай размовы



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Брытанскія вучоныя вывелі формулу ідэальнай тэлефоннай размовы сябру або сваяку, якая павінна доўжыцца 9 хвілін і 36 секундаў, паведамляюць інфармагенцтвы. Звесткі атрыманы ў ходзе даследавання, праведзенага сярод дзвюх тысяч чалавек.**

Устаноўлена, што больш за ўсё часу — тры хвіліны — ідзе на абмеркаванне асабістых навін. Тэмы, якія датычацца сваіх праблем, павінны займаць па адной хвіліне, яшчэ 60 секундаў неабходна ўдзяліць рабоце або вучобе, бягучым справам прысвяціць 42 секунды размовы, а 24 секунды — абмеркаванню надвор'я. На ўсе пытанні, што датычацца процілеглага полу, неабходны 24 секунды, плёткам аб знакамітасцях — 12 секундаў, а адна хвіліна і 42 секунды павінны быць патрачаны на смех і жарты.

Акрамя гэтага, даследчыкі падкрэсліваюць, што маўчанне таксама з'яўляецца адной са складовых ідэальнай тэлефоннай размовы: памаўчаць абаім абанентам варта не менш як 12 секундаў. І яшчэ адна хвіліна выдзелена на абмеркаванне агульных тэмаў.

Паводле звестак даследавання, адзін з пяці чалавек часцей за ўсё звоніць сваёй маці, і толькі тры працэнты рэспандэнтаў часцей кантактуюць з бацькам.

**Кар. БЕЛТА.**

## МАРОЗ

Свет і сусвет чалавека

**Мароз — персанаж казачнага фальклору і шэрагу каляндарных абрадаў, які ўзнік на падставе старажытнай міфалагічнай персаніфікацыі прыроднай стыхіі (паніжэнне тэмпературы паветра «замарожвае» ваду і ператварае ў снег і лёд). У казках і паданнях усходніх славян Мароз выглядае як дзед з белай доўгай барадой, у футры, валёнках і рукавіцах. Ён сімвалізуе парадак, строгасць, часам жорсткасць, але падабаецца сваёй шчырасцю і справядлівасцю.**

- За паважлівыя, цярплівыя адносіны да зімы, якая нясе чалавеку пэўныя нязручнасці і перашкоды, Мароз дапамагае чалавеку пераносіць холад і сцюжу. Тых, хто быў нецярплівы і надта няветлівы ў выказваннях аб зімовых халадах або снежных заносах, Мароз караў тым, што ператвараў у лядзяш ці снежную гурбу. Такія жорсткія праявы Мароза тлумачылі тым, што яго жонкай была сама Зіма, і непавага да яе крыўдзіла Мароза.
- Для тых, хто быў моцны духам і целам, хто любіў рухацца, гуляць на марозным паветры, Мароз закрываў рэкі лёдам, марозіў снежныя горкі, як кажуць, спрыяў і паляўнічым, і рыбакам, і падарожнікам.
- Да Мароза ў народзе звярталіся з пашанай, звалі Марозам Марозавічам, панам ці дзедам Марозам, часам ласкава, каб задобрыць, звалі так: Мароз-Маразенька, Марозка. У Мінскай губерні ў час Хрышчэнскай вячэры гаспадар кідаў у кут лыжку куцці і клікаў Зюзю (у некаторых беларускіх і заходнерускіх дыялектах так звалі Мароза).
- У тыя дні, калі надыходзілі самыя моцныя маразы, дзецям распавядалі казкі: «Зімой бегае па вуліцах маленькі дзядуля з доўгай сівой барадой — Мароз. Бегае і грукае. Ад яго грукату пачынаюцца моцныя маразы, рэкі апранаюцца ў лёд. Яго подых толькі ўзмацняе сцюжу. Шэрань і ледзяшы — яго слёзы, яго замёрзлыя словы. Снежныя аблокі — яго валасы».
- У культуры ўсходніх славян паўсюдна быў вядомы звычай, калі на Каляды, Саракі ці Вялікдзень Мароз запрашалі на святочную вячэру — на куццю, кісель, бліны, каб задобрыць яго, а ён у знак удзячнасці за частаванне не шкодзіў пасевы злакавых культур. Пры гэтым казалі: «Мароз, Мароз, хадзі куццю есці».
- У Беларусі, каб «задобрыць» Мароза, на Калядным тыдні варылі аўсяны кісель. Яго ставілі на падваконне, выносілі на ганак або вылівалі на агарод ці на вуліцу і казалі: *«Мароз, Мароз, не маразі (або не пабі) мой авёс, лепш прыходзь кісялю з'есці».* У Расіі абрад «заклікання» Марозу адбываўся ў Чысты чацвер перад Вялікаднем.
- У Беларусі існавала павер'е аб тым, што Мароз «лопаецца» (!) на галаве лысага чалавека, г.зн. памяншаецца, знікае. Таму ў дні самых моцных маразоў дзеці бегалі па вёсцы і лічылі дванаццаць знаёмых лысых мужчын. Калі называлі апошняга, прыгаворвалі: *«Мароз, мароз, ідзі лысых памарозь!»*

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

## Дзве даты

### 22 лістапада

**1876 год** — нарадзіўся (г. Гродна) Зіновій Пятровіч Салаўёў, адзін з арганізатараў аховы здароўя ў СССР. У 1918—1923 гадах — намеснік народнага камісара аховы здароўя Савецкай Расіі, начальнік Галоўнага ваенна-санітарнага ўпраўлення Чырвонай Арміі, старшыня Расійскага таварыства Чырвонага Крыжа і Чырвонага Паўмесяца, прафесар Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта. Аўтар навуковых прац па пытаннях тэарэтычных асноў аховы здароўя, вышэйшай медыцынскай адукацыі, гісторыі медыцыны, ваенна-санітарнай справы. Па яго ініцыятыве ў 1925 годзе створаны дзіцячы аздараўленчы лагер «Артэк».



**1783 год** — у Парыжы ажыццёўлены першы палёт на паветраным шары, напоўненым гарачым паветрам.

## Цытата дня:

***«Многія з тых, для каго дзень доўжыцца занадта доўга, скардзяцца, што жыццё кароткае».***

**Чарльз Калеб Колтан (1780—1832), англійскі літаратар.**

## ЭКСКУРСІЯ ПА СТАЛІЦЫ

**Рэгулярны аўтобусны экскурсійны маршрут па Мінску плануе арганізаваць у бліжэйшы час упраўленне фізічнай культуры, спорту і турызму Мінгарвыканкама.**

Падобныя экскурсіі на колах ужо арганізоўваюць некаторыя сталічныя турагенцтвы, расказаў на пасяджэнні ў мэрыі начальнік упраўлення Міхаіл Юспа. Аднак такога, які стаў бы для турыстаў візітнай карткай Мінска, няма. У рамках рэалізацыі гэтага праекта плануецца пабудаваць турысцка-інфармацыйны цэнтр на Прывакзальнай плошчы, які будзе аказваць экскурсійныя, даведачныя паслугі, рэкламаваць гарадскі турыстычны прадукт, рэалізоўваць сувенірную прадукцыю, а таксама арганізоўваць аб'екты грамадскага харчавання і дробнарознічнага гандлю сувенірамі. Чакаецца, што сёлета Мінск прыме больш як 400 тысяч турыстаў.

**Святлана ФРАЛЯНКОВА,** *«Мінск—Навіны».*

Сардэчна віншую з юбілеем **Усевалада Іванавіча КУПРЭВІЧА**.



*Няхай заўсёды Бог аберагае*
*Ад зла, хваробы і журбы*
*І ласку шчодра пасылае*
*Сягодня, заўтра і заўжды.*

**Жонка,** *в. Баяры.*

## Усміхнёмся!

У атэлье:
— Што будзем шыць?
— Сукенку!
— Талія і бюст — свае або нашы?

☺

**Цікава, а піць гарэлку апоўначы, лічыцца пасля працы або да?**

☺

Зампаліт на занятках пытаецца ў салдата, чаму той пайшоў у войска. Навабранец:
— Па-першае, я хачу абараняць сваю Радзіму...
— Правільна...
— Па-другое, служба робіць мяне мацнейшым...
— Так!
— Ну а па-трэцяе — мяне ніхто і не пытаўся!

☺

**Улады Егіпта і Турцыі патрабуюць, каб расійскія турысты фатаграфаваліся на замежны пашпарт п'янымі.**

☺

Медсястра хвораму:
— Годзе глядзець тэлевізар, час у ложак!
Хворы:
— А нас не застукаюць?

☺

**Прыходзіць мужык ва ўнівермаг і бачыць як адзін пакупнік крычыць:**
**— Што гэта такое! Я купіў тут каўбасу і мая цешча ёй атруцілася!**
**Мужык:**
**— Ты лепш чым скандал учыняць, скажы мне, у якім аддзеле ты гэтую каўбасу купляў?!**



Помста.

# ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

БЕЗ РЭЦЭПТА

## Мёд унутр і звонку



**Кашаль даўно не праходзіць? Паспрабуйце прагрэць бронхі мядовым кампрэсам. Так лечаць прастуду ў Балгарыі і на Тыбеце. Як правільна зрабіць аплікацыю?**

Калі няма высокай тэмпературы, выпіце гарачага чаю, разатрыце грудзі мёдам, накрыйце пергаментнай паперай, зверху цёплай коўдрай і паляжыце. Дзіцяці ці чалавеку з далікатнай скурай вобласць кампрэса папярэдне трэба змазаць алеем. Пасля таго, як адчуеце, што грудзі прагрэліся, а па целе разлілося прыемнае цяпло, змыйце мёд цёплай вадой, вытрыцеся ручніком і зноў змажце грудзі алеем — на гэты раз піхтавым ці эўкаліптавым.

Усе гэтыя меры засцярогі неабходныя таму, што мёд у чыстым выглядзе агрэсіўны і часта выклікае раздражненне. Калі пры насмарку вы закапваеце мядовы раствор у нос, абавязкова развядзіце яго вадой з алеем. Для лячэння лепш не выкарыстоўваць мёд ранніх збораў: кветкі ў маі-чэрвені часта даюць алергію. Ліпавы мёд — больш спакойны, вытрыманы.

Калі мёд загусцеў, можна паставіць яго на вадзяную лазню, каб разагрэць. Мёд стане празрыстым і ім можна будзе расцерціся. Аднак вада не павінна быць вышэй, чым 50 градусаў, інакш загінуць многія карысныя арганічныя злучэнні мёду.

СЕЗОННЫЯ КЛОПАТЫ

## Выбіраем абутак

**Надвор'е часта падносіць нам сюрпрызы, і каб не апынуцца заспетым неспадзеўкі праліўным дажджом ці замаразкамі, добра мець абутак на ўсе выпадкі жыцця.**

Самы ўдачны выбар для любога сезона — абутак з натуральнага матэрыялу, які не перашкаджае нармальнаму цеплаабмену.

Калі ж вы набываеце абутак са штучных матэрыялаў, то пераканайцеся, што хоць бы падкладка ў ім з натуральнай скуры ці тэкстылю. А яшчэ неабходна звярнуць увагу на матэрыял, з якога зроблена вусцілка. У ідэале яна павінна ўцягваць непрыемныя пахі, адводзіць вільгаць, знішчаць бактэрыі.

Для восені і вясны важна, каб абутак не прапускаў ваду і ў той жа час дазваляў нагам «дыхаць». Калі дэмісезонныя чаравікі ці боты зашпільваюцца пры дапамозе маланкі, яна павінна пачынацца не вельмі блізка да падэшвы, інакш ногі прамокнуць, калі вы ўступіце нават у неглыбокую лужыну. У адрозненне ад летняга дэмісезонны абутак не павінен прылягаць да нагі ўшчыльную, бо вы ж не будзеце яго насіць на голыя ногі. Прымярайце боты на шчыльную шкарпэтку.

У зімовых ботах ці чаравіках галоўнае — падэшва. Яна мусіць быць даволі тоўстай, з пратэктарам, які перашкаджае слізганню. Найбольш бяспечна ў галалёдзіцу насіць чаравікі з разнастайным малюнкам пратэктара — напрыклад, адна частка ў выглядзе палосак, другая — акруглых выступаў. Набойкі чаравікаў таксама павінны мець пратэктар і быць гумавымі, а не пластыкавымі, інакш нага будзе слізгацець. Лепш за ўсё захоўвае цяпло скураны абутак з падкладкай з натуральнага футра, напрыклад авечага ці цыгейкі, і футравымі вусцілкамі. Выбраўшы правільны зімовы абутак, вы можаце не баяцца моцных халадоў і слізкіх дарог.

-2538-

ДА ВАШАГА СТАЛА

## Прыгатуйце курачку...

**Булён з гэтай птушкі — выдатны сродак ад прастуды, сацыві — вытанчаная закуска, фаршыраваная курыца — упрыгажэнне любога стала. Яе любяць ва ўсім свеце. Прапануем некалькі арыгінальных рэцэптаў курыных страў.**

**...па-французску**



*4 кавалкі курыцы, 3 ст. лыжкі мукі, 50 г масла, 250 г цыбулі, 250 г дробных грыбоў, 3 зубкі часнаку, 4 буйныя памідоры, 300 г сухога вермуту ці віна, 250 мл курынага булёну, 2 ст. лыжкі таматнай пасты, некалькі лаўровых лістоў.*

*Для сухарыкаў: 3 ст. лыжкі масла, 4 лустачкі багету.*

Абкачайце курыцу ў муцэ, абсмажце на масле прыкладна 10 хвілін да залацістага колеру. Перакладзіце кавалкі на талерку. Цыбулю, грыбы, часнок дробна парэжце, пакладзіце на патэльню і абсмажце на моцным агні, пакуль цыбуля не стане залацістай. Дадайце дробна парэзаныя памідоры, лаўровы ліст, вермут (віно), булён і старанна размяшайце. Пакладзіце на патэльню курыцу, тушыце на працягу 30 хвілін.

Прыгатуйце сухарыкі: на масле абсмажце парэзаны кубікамі багет, абсушыце на сурвэтцы і пасыпце імі курыцу.



**...па-балгарску**

*600 г курыных грудак, 3 салодкія балгарскія перцы, палавіна сцябліны цыбулі-парэю, 150 мл курынага булёну, 50 мл белага сухога віна, 2—3 ст. лыжкі крухмалу, соль, перац на смак.*

Грудкі памыйце, зніміце скуру, парэжце. Выдаліце насенне ў балгарскага перца, парэжце тонкімі палоскамі, цыбулю-парэй — невялікімі кольцамі. Вылажыце курынае мяса, перац і цыбулю ў вялікую каструлю, заліце курыным булёнам, закрыйце накрыўкай і варыце да гатоўнасці на слабым агні. Развядзіце крухмал у белым віне, дадайце ў каструлю з курыцай і патрымайце на пліце яшчэ 10 хвілін, памешваючы.

Вылажыце ўсё на вялікае плоскае блюда. Падавайце на стол, упрыгожыўшы свежым зяленівам.

**...па-руску**



*1,5 л курынага булёну, 200 г здробненага белага мяса, 220 г пшанічнай мукі, 0,5 ст. лыжкі солі, 25 г масла, 2 яйкі, 150 мл вяршкоў.*

Прыгатуйце курыны булён. Змяшайце соль і муку, дадайце растопленае масла, яйкі і вяршкі. Замясіце мяккае, ліпкае цеста. На патэльні з тоўстым дном растапіце масла. З цеста зрабіце маленькія шарыкі мокрымі рукамі і абсмажце іх на патэльні да залацістага колеру на працягу 5 хвілін. Абсушыце шарыкі на папяровым ручніку, разлажыце па талерках, дадайце дробна парэзанае белае курынае мяса, наліце булён і адразу падайце на стол.

**Кухонныя дробязі**

- **Каб захаваць адчынены слоік таматнай пасты як мага даўжэй**, прысыпце змесціва соллю і заліце невялікай колькасцю алею — прадукт не заплесне.
- **У кампот з кіслых фруктаў трэба класці паболей цукру.** Паспрабуйце дадаць да яго яшчэ каліва солі — кампот стане яшчэ смачнейшы.
- **Чай стане больш духмяным**, калі ў пасудзіну, дзе ён захоўваецца, вы пакладзяце дробна парэзаных лімонных ці апельсінавых лупінак.

-2539-

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 7 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.
http://www.zviazda.by
e-mail: info@zvyazda.minsk.by
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 32.333 Індэкс 63850. Зак. № 6466. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12